Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

20 ЖНІЎНЯ 2016 г. СУБОТА № 160 (28270)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Навошта патрэбен цэнтр рэстаўрацыі**

СТАР. 9



**Наша агульная бабуля**

СТАР. 10



**Праца лечыць алкаголікаў**

СТАР. 12

# СПАС — ЯБЛЫЧКУ ЧАС



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Пяцігадовая Дар'я ДАВІДОВІЧ — удзельніца святочнай літургіі ў гонар Праабражэння Гасподняга, якая прайшла ўчора ў сталічным храме, што носіць імя Святой праведнай Сафіі Слуцкай.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Пры цяперашняй цане на прыродны газ выкарыстанне мясцовых відаў паліва на сучасных міні-ЦЭЦ у краіне абыходзіцца танней на 20-30%. Гэтая нафтавая паўза (а цана на газ прывязана да нафты) не будзе доўга цягнуцца. Будзе расці цана на нафту, будзе расці і на газ. Гэта трэба разумець, да гэтага трэба рыхтавацца. А таму эфектыўнасць выкарыстання мясцовых відаў паліва заўсёды ў перспектыве будзе ўзрастаць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9288 | ■ |
| Еўра | 2,1853 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0762 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

## «Сярэбраны» дэбют



Марыя Мамашук стала прызёрам Алімпійскіх гульняў і ўпершыню заваявала медаль для айчыннай жаночай барацьбы

**На шляху да фіналу (у вагавай катэгорыі да 63 кг) 23-гадовая беларуска атрымала ўпэўненыя перамогі над спартсменкамі з Казахстана, Швецыі і ЗША, а ў паядынку за «золата» сустрэлася з японкай Рысака Каваі.**

Каваі выйшла на дыван у статусе фаварыта. Яна чэмпіёнка Азіі і прызёрка чэмпіянату свету. Ужо на першай хвіліне наша Маша прапусціла нападзенне ў ногі, за што яе саперніца зарабіла 2 балы. Беларуска пастаянна спрабавала контратакаваць і навязвала саперніцы барацьбу, але японцы раз-пораз удавалася стрымліваць наступальныя парывы. Раз за разам Марыя трапляла ў захоп, што не дазваляла зраўняць лік у першым перыядзе. Заключная частка таксама прайшла пад дыктоўку японкі. Яна здолела правесці яшчэ адну атаку і зноў атрымала 2 балы. На фінішы паядынку Рысака Каваі ўдалося зарабіць яшчэ 2 ачкі, такім чынам — 6:0. У Марыі Мамашук сярэбраная ўзнагарода.

СТАР. 16

■ Спажывец

## НЕ ЎСЁ НОСІЦЦА, ШТО БЛІШЧЫЦЬ

### Ці ўсе дзіцячыя тавары бяспечныя?

**Сёння ў секцыях дзіцячых тавараў у бацькоў вочы разбягаюцца: столькі ўсяго прыгожага, стракатага, цікавага. Але акрамя праблемы выбару перад клапатлівымі дарослымі паўстае яшчэ адна: як сярод усяго гэтага мноства адшукаць тавары якасныя і галоўнае — бяспечныя. Асабліва цяпер, калі надзённая тэма — экіпіроўка дзіцяці ў школу ці садзік.**

Спецыялісты Дзяржстандарта адзначаюць: для гэтага трэба звяртаць сур'ёзную ўвагу на маркіроўку вырабу, яго знешні выгляд, а часам і знаёміцца з дакументамі, якія пацвярджаюць бяспеку тавару і яго адпаведнасць патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза. Вынікі праведзеных абласнымі інспекцыямі Дзяржстандарта праверак у першым паўгоддзі 2016 года паказалі, што на беларускім рынку ёсць адзенне, абутак для дзяцей, рукзакі, цацкі, якія з'яўляюцца небяспечнымі, хоць у параўнанні з 2015 годам адзначаецца зніжэнне парушэнняў па гэтых групах прадукцыі.



Фота БЕЛТА.

### «Фактар рызыкі» — абцасы і сінтэтыка

— Праверкі паказваюць, што даволі-такі часта вытворцы, імпарцёры і прадаўцы парушаюць патрабаванні тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза па бяспецы, маркіроўцы, а таксама выкананні правілаў абавязковага пацвярджэння адпаведнасці, расказвае **начальнік аддзела дзяржаўнага нагляду за тэхнічнымі рэгламентамі і стандартамі ў лёгкай, дрэваапрацоўчай прамысловасці і будіндустрыі інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і горадзе Мінску Людміла КУЗНЯЦОВА.** — Так, сярод тыповых парушэнняў можна назваць перавышэнне гранічнага значэння вышыні абцаса ў дзіцячым абутку, перавышэнне нарматыўнага значэння (не больш за 20%) укладання хімічных валокнаў у падкладцы з тэкстыльных матэрыялаў у абутку для самых маленькіх.

СТАР. 5

# ІМПАРТ І ЗАМЯШЧЭННЕ

## Прэзідэнт патрабуе больш актыўнай работы па выкарыстанні мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў

**Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па пытаннях эфектыўнасці іх выкарыстання. «Балюча глядзець, калі ў нас вялікая колькасць біярэсурсаў, якія можна выкарыстоўваць як паліва, проста прападае. Таму цяпер вельмі важна актывізаваць работу па выкарыстанні ўласных рэсурсаў, каб як мага менш залежаць ад імпарту і скарацьць сабекошт вырабляемай прадукцыі», — заявіў Прэзідэнт.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэта тэма ва ўмовах залежнасці Беларусі ад імпартных энергарэсурсаў з кожным годам становіцца ўсё больш актуальнай і вострай.

У свой час на ўзроўні Прэзідэнта быў прыняты шэраг рашэнняў у сувязі з выкарыстаннем мясцовых відаў паліва. Пры гэтым наведваліся асобныя прадпрыемствы, рэалізаваны шматлікія пілотныя праекты. Размова на нарадзе ішла аб тым, што зроблена ў гэтым кірунку, аб эфектыўнасці гаспадарання і неабходнасці зніжэння затрат.

Прэзідэнт канстатаваў, што ў гэтым кірунку ўжо зроблена нямала. Напрыклад, гадавы аб'ём у памеры больш як 2 млрд куб. м закупляемага газу ўдалося замясціць мясцовымі відамі паліва. «Але гэта толькі дзясятая частка той колькасці каштоўнай сыравіны, якую мы імпартуем. А купляем мы звыш 20 млрд куб. м прыроднага газу. Толькі на гэтыя мэты краіна штогод траціць каля $3 млрд. Упэўнены, мы можам і павінны істотна скарацíць гэты дарагі расходны артыкул», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што яму дакладваюць аб фактах нерацыянальнай эксплуатацыі дзеючых энергаўстановак і рэалізацыі эканамічна неабгрунтаваных праектаў. «Шмат у чым гэта адбываецца з-за няўзгодненасці дзеянняў галіновых ведамстваў і мясцовых органаў улады, а таксама ўрада», — цытуе кіраўніка дзяржавы БЕЛТА.

Перад удзельнікамі нарады Прэзідэнт паставіў некалькі пытанняў. У прыватнасці, у чым прычыны малаэфектыўнага выкарыстання прыродных багаццяў Беларусі; якія ёсць рэзервы для паляпшэння работы ў гэтым кірунку і якія ў сувязі з гэтым патрабуецца прыняць рашэнні; як увязаны паміж сабой планулемае нарошчванне спажывання мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў і тая дадатковая энергія, якую плануецца атрымаць пасля ўводу ў строй Беларускай АЭС.

«Патрэбны сістэмны, эканамічна выверааны падыход да вырашэння ўсяго комплексу пытанняў, звязаных з выкарыстаннем мясцовых відаў паліва. Прайшоў пэўны перыяд, калі мы прымалі рашэнні і арганізоўвалі гэту справу. І трэба сёння, аб'ектыўна прааналізаваўшы сітуацыю, або карэкціраваць нашы планы і рашэнні, або дзейнічаць больш аператыўна ў вырашэнні гэтых праблем», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Па выніках нарады даручана яшчэ раз з улікам існуючых рэалій вывучыць і пры неабходнасці карэкціраваць прынятую ўрадам праграму ў сферы энергазберажэння на 2016—2020 гады. Асабліва з улікам будучага ўводу АЭС і неабходнасці эфектыўнага выкарыстання ёй аб'ёмаў электраэнергіі, якія з яе паступяць. Дадзены і некаторыя іншыя канкрэтныя даручэнні, у тым ліку па ліквідацыі выяўленых недахопаў на шэрагу аб'ектаў.

# Ствараецца Універсітэт грамадзянскай абароны

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Універсітэт грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь» ствараецца ў адпаведнасці з Указам № 313 «Аб рэарганізацыі ўстаноў адукацыі», які падпісаў Прэзідэнт.**

Новая адукацыйная ўстанова ствараецца шляхам аб'яднання існуючых навучальных устаноў МНС — Камандна-інжынернага інстытута, Гомельскага інжынернага інстытута, Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, якія ажыццяўляюць цяпер навучанне па аднолькавых або блізкіх спецыяльнасцях.

Універсітэт грамадзянскай абароны будзе створаны на базе Камандна-інжынернага інстытута ў Мінску і будзе ўключаць у сябе філіялы ў Гомелі і ў п. Светлая Рошча ў Барысаўскім раёне, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

У Мінску будуць навучацца курсанты для атрымання вышэйшай адукацыі, будзе функцыянаваць магістратура, ад'юнктура, дактарантура. У філіяле ў Гомелі будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка па рабочых прафесіях (ратавальнікаў-пажарных, вадзіцеляў, дыспетчараў), у п. Светлая Рошча — павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка работнікаў.

■ Выбары-2016

# Маладыя гатовы ісці ў парламент

**Колькасць кандыдатаў у дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў ва ўзросце да 30 гадоў складае 10% ад усіх зарэгістраваных. Першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ лічыць, што гэтага недастаткова. Ролю маладых людзей у палітыцы абмеркавалі падчас «Адкрытага дыялогу» на тэму «Моладзь і выбары: формула адказнасці».**

## Моладзі адчынены дзверы

— Я падзяліў бы два паняцці: хто будзе абраны дэпутатам і хто вылучаецца ў якасці кандыдата, — заўважае Андрэй Эдуардавіч. — Што тычыцца кандыдатаў, 10% — гэта мала. Да 31 года чалавек ужо фарміруе ў сабе шэраг якасцяў, якія могуць дазволіць вырашаць пытанні на ўзроўні дэпутата. І гэта вопыт. Мы будзем працаваць у гэтым кірунку, каб з кожным годам у моладзі было больш жадання праявіць сябе, у перспектыве нешта зрабіць для сваёй краіны. Самая галоўная мэта кожнага кандыдата ў дэпутаты, на маім глыбокім перакананні, — прынесці карысць для сваёй дзяржавы, сваёй тэрытарыяльнай акругі. На жаль, можна канстатаваць, што частка кандыдатаў, якія сёння ідуць на выбары, перш за ўсё думаюць пра тое, каб сябе забяспечыць. Людзі часта не разумеюць, што кандыдат і потым дэпутат — гэта каласальная адказнасць. Трэба гаварыць, у тым ліку, пра маральныя арыенціры і дзелавыя якасці.

Удзел у абмеркаванні прынялі і міжнародныя назіральнікі за бягучай выбарчай кампаніяй. **Вольга КРЭМСКАЯ, прадстаўнік місіі назіральнікаў Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД**, падзялілася сваім поглядам на палітычную актыўнасць моладзі:

— У Гомельскай вобласці, калі праходзіла рэгістрацыя кандыдатаў, мы бачылі, што было вельмі шмат назіральнікаў ад БРСМ, моладзь была задзейнічана і ў рабоце выбарчых камісій. Я не лічу, што ў юнакоў і дзяўчат мала вопыту для актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці краіны. Па-першае, яны чатыры гады таму ўжо назіралі за выбарчым працэсам у парламент. Па-другое, цяпер ёсць усе медыйныя магчымасці: пра ўсё можна даведацца на інфармацыйных парталах. Я ўбачыла вельмі значную палітычную актыўнасць моладзі не толькі ў сталіцы, але і ў рэгіёнах.

## Працуем сумленна

Больш за 2700 прадстаўнікоў БРСМ акрэдытаваны ў якасці назіральнікаў за выбарамі ў ніжнюю палату беларускага парламента. **Першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Аляксандр ІВАНОЎСКІ** пазначыў ролю, якую яны будуць выконваць у выбарчым працэсе:

— Мы бачым, як на сайце Цэнтрвыбаркама з'яўляюцца метадычныя матэрыялы. Яны назапашваюцца, акумулюючы наш і замежны вопыт. Там прапісана, у тым ліку, як трэба працаваць назіральнікам. А гэта павышае палітычную культуру. Назіральнік патрэбны яшчэ для таго, каб на падзеі мелася некалькі пунктаў гледжання. Яны павінны ў выпадку скаргі даць зварот адназначную тую карціну, якая была. Назіраць на свае вочы палітычную барацьбу — гэта вельмі важна і цікава.

А межы работы будучых дэпутатаў акрэсліў **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Іван ГАРДЗЕЙЧЫК**. Ён адзначыў, што «кожны на сваім месцы павінен працаваць прафесійна. І трэба, каб чалавек, які заняў крэсла дэпутата, нездарма правёў у ім свой тэрмін. Ён павінен далей працягнуць сваё развіццё. З дэпутата можа вырасці добры кіраўнік».

## За прафесіяналамі

Адным з «сакрэтаў" добрай работы з'яўляецца жыццёвы і прафесійны вопыт, у тым ліку па вырашэнні праблем выбаршчыкаў. Як трэба адносіцца да сваёй пасады, расказала **намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Святлана СІТНІКАВА:**

— Я з'яўляюся дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. Парламент — гэта людзі, якія працуюць з законамі. А праца ў мясцовых саветах набліжана да практыкі, дзе законы рэалізуюцца. Дэпутацкі абавязак — дапамагаць вырашаць пытанні практычнага характару. Гэта грамадская нагрузка, акрамя асноўнай працы. Неабыякавы чалавек, які мае вопыт і які гатовы ім падзяліцца, павінен ісці на гэтую пасаду. Гэта адказнасць за тое, што мы робім.

У дыскусіі прымалі ўдзел і маладыя людзі з усіх рэгіёнаў краіны. Сярод якасцяў і навыкаў, якія яны жадаюць убачыць у кандыдатаў у дэпутаты, юнакі і дзяўчаты адзначылі вопыт работы, жаданне працаваць над сабой і рабіць усё магчымае на карысць дзяржавы.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

# Роўныя правы для кандыдатаў

**Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі забяспечаць роўныя правы і магчымасці кандыдатам у дэпутаты, каб яны маглі прадставіць сваю перадвыбарчую праграму. Пра гэта паведаміла ў Рагачове ў размове з журналістамі міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

«Разнастайнасць прадстаўнікоў, якія хочуць стаць дэпутатамі, вядома, ажывіць наша інфармацыйнае поле. З кожным днём мы будзем усё з большай і большай цікавасцю сачыць за тым, як ідзе паміж імі спаборніцтва ў прадстаўленні сваіх платформаў», — сказала Лілія Ананіч. У цэлым тэматыка выбарчай кампаніі досыць актыўна абмяркоўваецца ў сродках масавай інфармацыі. Асноўная задача — данесці аб'ектыўную інфармацыю аб выніках усіх этапаў кампаніі, а таксама заклікаць беларусаў да ўдзелу ў выбарах — выконваецца.

«Сёння мы бачым, што ідзе роўны тон у асвятленні выбараў. Ёсць, вядома, некаторыя ангажыраваныя інфармацыйныя рэсурсы, якія знаходзяцца, як правіла, за межамі краіны і маюць іншы пункт гледжання. Што ж, гэта іх права, да таго ж у нас адкрытае інфармацыйнае поле. Разам з тым мы здольныя ў поўным аб'ёме забяспечыць выкананне інфармацыйных задач у нашай краіне. Таму, я ўпэўнена, нашы грамадзяне, у тым ліку і дзякуючы сродкам масавай інфармацыі, будуць свядома выбіраць свайго дэпутата», — падкрэсліла міністр.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

**ПРАМАЯ ЛІНІЯ**

## САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ: ШТО ГАРАНТУЕ ДЗЯРЖАВА?

Якія віды сацыяльных паслуг можна атрымаць у тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання, і хто мае права на іх атрыманне? Куды ісці ў выпадку цяжкай жыццёвай сітуацыі? На якія формы сацыяльнага абслугоўвання варта звярнуць увагу пенсіянерам? Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць па «прамой лініі» госцю нашай рэдакцыі — **галоўнаму спецыялісту аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяне Мікалаеўне ТАЛАЛАЕВАЙ.**

***Тэлефануйце 23 жніўня з 11 да 12 гадзін па нумары 8 (017) 287-18-71.***

Папярэднія пытанні можаце задаць **23 жніўня** па тым жа тэлефоне **з 9 да 11 гадзін** або дасылаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас **info@zviazda.by** або па пошце: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком на 3 года помещения общей площадью 36,1 кв.м в капитальном строении, инв. № 410/С-24362 по адресу г. Волковыск, ул. Жолудева, 55Б |
| **Начальная цена продажи** | 122,74 р. (сто двадцать два рубля семьдесят четыре копейки) с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | 3,0 |
| **Сумма задатка** | 12,27 (двенадцать рублей двадцать семь копеек) |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение арендуемых помещений – для оказания страховых услуг |
| **Продавец** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, Тел. 8-0163-42-25-08 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 21 сентября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений — 15 сентября 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок 45-05-38 — Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

# Кнігі — у падарунак Рагачову

**Госці сёлетняй сталіцы Дня беларускага пісьменства падораць гораду свае любімыя творы**

**Пра такую адметную акцыю, што пройдзе ў Рагачове, расказала падчас пасяджэння аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА, піша БЕЛТА.**

Віцэ-прэм'ер падкрэсліла, што папярэдняе пасяджэнне аргкамітэта прайшло ў маі, і з таго часу ў горадзе праведзена вялікая работа па абнаўленні сацыяльных, культурных аб'ектаў. «Горад проста не пазнаць. Упэўнена, што свята пройдзе на высокім арганізацыйным і інфармацыйным узроўні, яно спадабаецца жыхарам і гасцям Рагачова», — зазначыла Наталля Качанава.

Гасцям, што прыедуць сюды з усёй Беларусі, а таксама замежных краін, прапануюць прывезці і падарыць гораду сваю любімую кнігу. Гэтыя выданні папоўняць бібліятэчны фонд Рагачова. Наталля Качанава зазначыла, што новая акцыя можа стаць адной з традыцый правядзення Дзён беларускага пісьменства і ў іншых гарадах краіны.

Але не толькі кнігі застануцца як напамін пра Дзень пісьменства. У Рагачове якраз у дзень адкрыцця свята расчыніць дзверы абноўлены Дом кнігі. Тут размесціцца магазін «Першацвет», а таксама бібліятэка і чытальная зала. Пра гэта паведаміла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. Менавіта Міністэрства інфармацыі выступіла з ініцыятывай падарыць жыхарам горада гэты значны сацыяльны аб'ект.

Адметна, што падчас свята назавуць лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі, на яе суісканне сёлета было прадстаўлена больш як 70 твораў. Да Дня беларускага пісьменства традыцыйна падрыхтаваны тэматычныя выданні, прысвечаныя Рагачову і ваколіцам. Гэта кнігі «Народная і духоўная культура Рагачоўскага краю», зборнік «Добры дух зямлі Дняпроўскай: Рагачоўшчына літаратурная», альбом «Рагачоў». Гэтыя выданні можна будзе набыць у кнігарнях, яны стануць і выдатнымі падарункамі гасцям рэгіёна.

Праграма Дня беларускага пісьменства, што пройдзе ў Рагачове 4 верасня, уключае каля 70 мерапрыемстваў. Гэта знаёмства з літаратурнымі падворкамі, выстаўка СМІ, літаратурныя квэсты, сустрэчы з пісьменнікамі і прэзентацыі кніг. Напярэдадні святкавання пройдзе навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», а ў Нацыянальнай бібліятэцы адбудзецца міжнародны «круглы стол», у якім прымуць удзел літаратары з 12 краін.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

● Тым часам

## Рух у рытме харэя і ямба

**Вершы беларускіх паэтаў гучаць з сённяшняга дня ў адным з гомельскіх аўтобусаў. Гомельаблаўтатранс сумесна з Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкай у Год культуры і напярэдадні Дня беларускага пісьменства прадставілі новы арыгінальны праект.**

Па маршруце №20 «Старая Валатава — Медгарадок» курсіруе тэматычна аформлены «паэтычны» аўтобус. У салоне пасажыры знаёмяцца з творчасцю беларускіх класікаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча і іншых. Аналагічны аўтобус з 21 жніўня выйдзе на маршрут у Рагачове. Арганізатары праекта запрашаюць да супрацоўніцтва аматараў беларускай літаратуры для далейшага ўдасканалення і развіцця ідэі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Фестывалім

# У ДРЫБІН — НА ТАРЖКІ

## Гасцей запрашае «сталіца» шапавалаў

**Сёння ў гарадскім пасёлку Дрыбін праходзіць VI рэгіянальны фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі».**

«Мастацкі вернісаж», дзе можна набыць вырабы майстроў дэкаратыўна-ўжыткавай творчасці або самім навучыцца нейкім карысным прыёмам, пачне працаваць з раніцы. Усё гэта будзе суправаджацца спевамі і танцамі творчых калектываў. У «Таржках» прымаюць удзел артысты і майстры з Беларусі, украінскага Чарнігава, расійскага Смаленска, а таксама Манастыршчынскага і Хіславіцкага раёнаў Смаленскай вобласці. Клубныя ўстановы Дрыбінскага раёна арганізоўваюць работу "Таржковых крамніц", дзе можна будзе азнаёміцца з дзейнасцю розных устаноў і прадпрыемстваў Дрыбіншчыны. Дзяцей чакаюць забавы на «Гульнявой паляне». На паэтычныя чытанні запросіць «Літаратурная гасцёўня», дзе адбудзецца падвядзенне вынікаў штогадовага конкурсу творчых работ «Славім Дрыбінскі наш край».

Арганізатары прыгожага народнага свята — аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Дрыбінскага райвыканкама і цэнтралізаваная клубная сістэма раёна.

— Гэты фестываль з'яўляецца візітоўкай раёна, нашы людзі чакаюць гасцей, каб дзяліцца з імі ўсмешкамі і сакрэтамі народных традыцый, — кажа намеснік **старшыні Дрыбінскага райвыканкама Дзмітрый ПІМАШЭНКА.** — Вельмі радуе, што свята з кожным годам набірае папулярнасць. Сёлета да нас завітаюць удзельнікі з Карэліі і Малдовы, якія прадэманструюць стравы сваіх народных кухняў. Пра нас ведаюць нават у далёкім замежжы. Бо Дрыбін — гэта адзіная шапавальская сталіца не толькі ў маштабах краіны, але, магчыма, і ўсяго свету.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Зачапіла

Рэверс з сеціва

**М. Садоўская**
**АДЗІНАЯ Ў БЕЛАРУСІ БЛАНДЗІНКА-ДАЛЬНАБОЙШЧЫЦА ЖЫВЕ Ў ГРОДНЕ**
*(«Звязда» за 13 жніўня)*



Бландзінка-дальнабойшчыца малайчына! Нам трэба як мага больш такіх мэтанакіраваных дзяўчат, бо супольнасць канапкавых ныцікаў з кожным годам павялічваецца. Рэдка сустракаюцца смелыя, працавітыя, захопленыя цяжкай прафесіяй. Лёгка сядзець на шыі ў бацькоў, а пасля вяселля — у мужа. Сёння шубу патрабуе, заўтра — машыну і экзатычныя пляжы. З гадамі казка пра залатую рыбку набывае абароты. А Вераніка справай займаецца і не мае часу на скаргі. Губляць энергію на псаванне нерваў мужу яна таксама не стане. Вядома, на рабоце за дзвесце рублёў плакаць не будзе. Не падабаецца заробак? Шукай новую работу! Ты ж кіроўца ўласнага лёсу! А лёгкі хлеб самі ведаеце дзе знаходзіцца.

Дальнабой — гэта цяжкае, часам небяспечнае жыццё нават для мужчыны. Таму дзяўчына ў фуры на магістралі выклікае ў любога адказнага чалавека захапленне і толькі ў лайдака і ныціка — папрок.

Шчаслівай дарогі табе, Вераніка!

**Алена Шыбека,** *г. Гродна.*

**С. Яскевіч**
**«З АКОЛЬНІКА Ў ЯСЕНЬ ПРАЗ БЕЛЫ ЛЯСОК»**
*(«Звязда» за 17 жніўня)*

Вёскі, пра якія ідзе гаворка ў артыкуле, і іншыя населеныя пункты гэтай зоны аб'ядноўвае цяпер аб'язная дарога вакол Белавежскай пушчы. Колькі было скептыкаў падчас яе будаўніцтва і потым! Казалі, маўляў, грошы пайшлі вялікія, а дарога амаль пустая. Я катэгарычна з гэтым не пагаджуся. Дарога ніколі не бывае лішняй. Як той казаў, не цяпер, то ў чацвер, але яна абавязкова спатрэбіцца. Для маленькіх вёсак новая дарога азначае новы ўзровень якасці жыцця. І ў матэрыяле гаворыцца, што некаторыя бяруць участкі з прыцэлам на аграсядзібы. А гэта добры знак.

І яшчэ. З вялікай цікавасцю прачытаў пра Фёдара Канстанцінавіча Саевіча. Я быў на прэзентацыі яго кнігі. Сваім знаёмым потым раіў пачытаць, асабліва тым з іх, хто цікавіцца пушчай. Акрамя вялікага гістарычнага, фактычнага матэрыялу аўтар прыводзіць цікавыя выпадкі з жыцця ляснічага. Напрыклад, гісторыю пра п'янага зубра. Зубр знайшоў падпольны самагонны заводзік і выпіў вёдзер пяць брагі. Потым валяўся п'яны паўдня. А праз колькі дзён прывёў на месца сваіх суродзічаў, мабыць, хацеў пачаставаць. Але гаспадар бровара добра ўмацаваў крышкі ёмістасцяў. Звяры засталіся цвярозымі. Аказваецца, аматары выпіць сустракаюцца не толькі сярод людзей.

**Уладзімір Краўчук,** *г. Пружаны*

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «Калі газіфікуюць вёску і ці хопіць у нас на гэта сродкаў?»

**На «гарачую лінію» нашай газеты паступіў чарговы зварот, на гэты раз ад жыхаркі вёскі Таль Любанскага раёна Таццяны Аляксандраўны Вядзерскай, і датычыўся ён газіфікацыі населенага пункта. Па словах заяўніцы, тэлефанавала яна ад імя ўсіх членаў кааператыва — каля 180 чалавек, якіх цікавіла аднолькавае пытанне: калі ў іх дамах з'явіцца газ?**

— Кааператыў быў створаны тры гады таму. За гэты час выраблены толькі праект, на які пайшло каля 10 мільёнаў рублёў недэнамінаваных грошай. А далей колькі давядзецца плаціць, мы не ведаем. Хвалюемся: ці пацягнем гэтую справу фінансава? Ці будзе нам якая дапамога з боку дзяржавы? У нашай вёсцы даўжыня адной вуліцы складае пяць кіламетраў, а іх такіх — некалькі. Мы падлічылі, што толькі па самой вёсцы трэба пракладваць 22 кіламетры труб, — хвалявалася Таццяна Аляксандраўна.

На гэтыя і іншыя пытанні жыхаркі вёскі Таль дакладна і аператыўна даў адказы **намеснік старшыні Любанскага райвыканкама па будаўніцтве, жыллёва-камунальнай гаспадарцы і архітэктуры Дзмітрый СУХАН.**

Сапраўды, кааператыў па газіфікацыі населенага пункта існуе ў вёсцы Таль тры гады. Гэта невялікі тэрмін, заўважыў суразмоўца, калі параўнаць сітуацыю з іншымі абласцямі. Там жыхары чакаюць сваёй чаргі па сем-восем, а часам і па дзесяць гадоў. Таму ў Талі «пытанне так востра не стаіць».

— Фінансаванне будоўлі будзе весціся згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №368 ад 02.06.2006 года, якім агаворваецца правядзенне газіфікацыі ў гарадах і населеных пунктах з колькасцю жыхароў да 20 тысяч чалавек, — распавёў далей Дзмітрый Мікалаевіч. — Гэта азначае, што 70 працэнтаў кошту работ будзе прафінансавана з бюджэту, 30 працэнтаў — за кошт сродкаў грамадзян. Невялікая праблема заключаецца ў тым, што вёска Таль знаходзіцца ўдалечыні ад магістральных газаправодаў высокага ціску. Так, бліжэйшая да населенага пункта размеркавальная шафа размешчана ад яго за 5,4 кіламетра. Але дасягнута дамоўленасць: «Мінаблгаз» зробіць патрэбныя работы на ўсім адрэзку, хаця першапачаткова гаворка ішла толькі пра тры кіламетры падводкі трубы да вёскі. Зроблена гэта з мэтай зменшыць фінансавую нагрузку па газіфікацыі на насельніцтва.

Агулам праект ацэнены ў 9 мільярдаў недэнамінаваных рублёў. Атрымаць такую суму з бюджэту адразу (нагадаем, 70 працэнтаў ад названай лічбы) будзе праблематычна. Таму прынята рашэнне ўвесь праект раздзяліць на чатыры пускавыя комплексы — ажыццяўляць па адным у год. Кожны раз газіфікаваць некалькі вуліц, даючы іх жыхарам у дамы блакітнае паліва. Вёсці ўвесь праект цалкам не атрымаецца, паколькі адразу ўвесь ён яшчэ не будзе прыняты.

— Калі не ў наступным годзе, дык у 2018-м усё зрушыцца з месца. Прыкладна паўтара гады таму ў кааператыве па газіфікацыі ў Талі змяніўся яго старшыня. Новы чалавек шмат робіць у гэтым кірунку, — зазначыў намеснік старшыні райвыканкама па будаўніцтве, жыллёва-камунальнай гаспадарцы і архітэктуры.

Чаму не хутчэй? У раёне кааператыў па газіфікацыі ў названай вёсцы — не адзіны. Напрыклад, у Любані таксама ёсць чарга, як і ў іншых населеных пунктах. З улікам таго, з якой даты былі створаны такі кааператыў і калі ў яго ўступалі грамадзяне, і будуць распачынацца патрэбныя работы. Адказваючы на пытанне нашай заяўніцы пра магчымы кошт правядзення работ, Дзмітрый Сухан заўважыў, што канчатковая сума для канкрэтнага спажыўца будзе размярковацца з улікам колькасці дамоў на вуліцы, куды гаспадары пажадаюць правесці блакітнае паліва, колькасці ўводаў у жыллё і іншага. Як запэўніў суразмоўца, калі прыйдзе час, уся патрэбная інфармацыя будзе даведзена да вяскоўцаў, удзельнікаў кааператыва, праз агульныя сходы і мясцовы друк.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Справы духоўныя

# У Мінск прыбудуць мошчы з Афона

## Пакланіцца ім вернікі змогуць да канца жніўня

**У суботу, 20 жніўня, у Беларусь прывязуць пачэсную галаву прападобнага Сілуяна Афонскага. Мошчы будуць знаходзіцца ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска да 31 жніўня.**

Святыня з праваслаўнага Свята-Панцеляймонава манастыра на гары Афон, з якой яны да гэтага моманту ніколі не вывозіліся, будзе ў суправаджэнні манахаў даста́ўлена ў мінскі кафедральны сабор па блаславенні Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Сілуян Афонскі нарадзіўся на Тамбоўшчыне (Расія) і яшчэ з маладых гадоў імкнуўся да манаскага жыцця. Яго мара стаць манахам Святой Гары здзейснілася. І хаця ён не меў высокіх санаў, але пад канец жыцця сярод братоў атрымаў званне старца — дасведчанага духоўнага настаўніка. Мудрыя выказванні прападобнага чытаюць і дагэтуль, кнігі з імі выдаюцца далёка за межамі Афона і нязменна карыстаюцца папулярнасцю.

На Святой Гары існуе даўняя традыцыя даставаць з магіл астанкі манахаў праз тры гады пасля іх пахавання і пераносіць у спецыяльную пахавальню — так званую «косніцу». Таму ў наш час міратачывая галава прападобнага знаходзіцца ў Пакроўскім храме Свята-Панцеляймонава манастыра ва ўпрыгожаным каштоўнымі камянямі срэбным каўчэгу.

Па словах Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, кожнаму верніку карысна будзе пакланіцца мошчам прападобнага. «Мы не павінны адчайвацца ў сваіх падзеннях і грахах. Ёсць выйсце з гэтага становішча. Галоўнае — не згубіць веру. Галоўнае — каб мы зразумелі значэнне Таінства пакаяння. Нездарма прападобны Сілуян заклікаў людзей пакаяцца і выправіцца. Такім быў і сам прападобны: падаў, падымаўся, але заўжды каяўся. І цяпер ён дапамагае ўсім, хто жадае стаць на выратавальны шлях і звярнуцца да яго з малітвай», — лічыць Уладыка.

На афіцыйным сайце Беларускай праваслаўнай царквы размешчана падрабязная інфармацыя пра жыццё прападобнага. Там жа можна паслухаць аўдыякнігі яго твораў і больш даведацца пра прынясенне мошчаў святога ў Беларусь.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

■ Выбары-2016: праграмы кандыдатаў

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА
### УЛАДЗІМІРА ПАДГОЛА

**Кандыдат у дэпутаты парламента па Старавіленскай акрузе №105 ад БНФ**



Сябры, грамадзяне, выбаршчыкі!

Прыхільнікі Лукашэнкі і яго апаненты!

Мы — нашчадкі тых, хто перамог крыжаносцаў і гітлераўскі фашызм. А таму мы мусім жыць значна лепш, чым сёння жывуць немцы Германіі.

Мы — народ Пераможца! А жывем жабракамі.

Хачу як мага хутчэй перамагчы тых, хто давёў нас да жабрацтва.

Мы ў Саюзнай дзяржаве з Расіяй, якая ваюе на Данбасе, у Сірыі, захапіла Крым, частку Грузіі.

Расія за бясцэнак купляе нашы тавары, і вы маеце мізэрныя заробкі. А калі Расія, разрабаваная алігархамі, адмовілася купляць нашы тавары, тады многія з нас страцілі працу. Няма за што жыць, няма чым карміць дзетак і купляць лекі. А вас яшчэ запісалі ў дармаеды і прымушаюць плаціць падатак! Здзек з людзей! Ганьба!

Мы неадкладна адменім падатак на дармаедства!

Мы адменім закон аб утварэнні Саюзнай дзяржавы з Расіяй, што пярэчыць Канстытуцыі!

Трэба — Адрадзіць Незалежнасць і Суверэнітэт Беларусі.

Гэты Саюз — пагроза кожнаму з нас! Кармушка для арды чыноўнікаў-алігархаў, якія кормяцца плёнам Вашай працы! Яны маюць «виллы» па ўсім свеце, валютныя рахункі ў афшорах, а Вам дураць галаву адраджэннем саюза. Гэта саюз хціввых махляроў!

Мы сталі прыбудовай да Расіі. Нас клічуць «мастом», «раздарожжам», «трубой».

**А ці могуць нармальныя людзі жыць на мосце ці пад мостам? Не! Жыць на трубе? Не!**

Мы сталі краінай-пыласосам, які смокча з Расіі наркотыкі, злачынцаў, мігрантаў, зброю і тэрарыстаў. Нашу моладзь спойваюць і труцяць наркатой.

Лукашэнка заявіў, што з Расіі ў Беларусь паступае наркотыкаў больш, чым з усіх астатніх краінаў, разам узятых. Але ж між імі ёсць мяжа, якая ахоўваецца.

Партыя БНФ лічыць, што трэба ўвесці наркакантроль на мяжы з Расіяй. А вось з Польшчай і Літвой мы мусім адкрыць межы. У іх тавары каштуюць значна танней, чым у нас.

На мяжы з Расіяй трэба ўвесці кантроль і са зброяй. Лукашэнка заявіў амерыканцам, што Беларусь наводнена зброяй, а яна без перашкод прэ з Расіі! Бо з ёй няма кантролю на мяжы.

**Калі зброя бесперашкодна будзе ісці да нас, тады Беларусь стане як крывавы Данбас.**

Беларусь — у АДКБ. У складзе АДКБ беларусы атрымалі пагрозу вайны, якую вядзе Расія. Трэба выйсці з АДКБ і тым самым захаваць жыццё нашай моладзі!

А эканамічны Еўразійскі звяз — гэта расійскі падман! Лукашэнка аддаў эканамічны суверэнітэт еўразійскай эканамічнай камісіі. Але ж гэта пярэчыць Канстытуцыі. Пуцін падмануў нас, абяцаючы, што ў Еўразійскім звязе будуць аднолькавыя кошты на газ і нафту.

**Еўразійскі саюз — скасаваць! А з Еўропай сябраваць-гандляваць!**

Мы сталі залежаць ад крамлёўскіх крэдытаў. Жыць пазычаючы з года ў год мільярды даляраў, як робіць Лукашэнка і яго памагатыя, — гэта — будучая галеча для нашых дзетак і ўнукаў. Ім наканавана стаць рабамі алігархаў Расіі і ўсё сваё жыццё аддаваць даўгі.

Я мару, каб кожны з Вас не меў даўгоў. Хачу, каб кожны з Вас меў сваю кватэру ды яшчэ дом у вёсцы.

Лічу, што кожны дарослы ў нашай краіне, калі захоча, можа мець свой легкавы аўтамабіль. Некалькі год таму мы былі на крок ад гэтага. Наша партыя БНФ хацела правесці рэферэндум, каб адмяніць мыты на легкавыя аўто. Уладатрымальнікі забаранілі рэферэндум і не далі Вам набываць танныя аўто з усяго свету.

Мы — народ Будаўнік!

Можам пабудаваць дзяржаву з годным і заможным жыццём для кожнага. Пабудаваць Наш Дом-Храм.

Мы дасягнём гэтага, калі **Адродзім Незалежнасць і Суверэнітэт і створым сваю дзяржаву.**

Зможам, калі над краінай будзе лунаць сцяг Хрыстовых колераў — Бел-чырвона-белы. Зможам, калі ачысцім нашу Рэспубліку ад расійскіх вайсковых баз! Наркотыкаў! Зброі!

Мы зажывём багата, калі парламент стане асноватворнай цаглінай дзяржаўнага будаўніцтва, а не той, якую дасталі з прэзідэнцкай кішэні і далі ўсім «па галаве» — павялічылі пенсійны ўзрост.

Мы станем заможнымі і шчаслівымі, калі ўвядзём прыватную ўласнасць на зямлю і абаронім прыватную ўласнасць законам ды незалежным судом.

Дык давайце разам з намі пад гербам ПАГОНЯ

Ратаваць, Бараніць, Будаваць наш Дом — Беларусь!

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА
### КАРАЛІНЫ АЎХІМОВІЧ

# ЗА МОЦНУЮ БЕЛАРУСЬ! «ЛДПБ — МОЦНАЯ БЕЛАРУСЬ»



Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі гаворыць: «За Моцную Беларусь!». Бо ўсе мы хочам стабільнасці, росквіту, росту дабрабыту і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Такое магчыма толькі ў Моцнай Беларусі, а Моцная Беларусь — гэта парадак у краіне, дастатак у доме! Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі аб'ядноўвае больш як 50 тысяч грамадзян, гэта самая магутная палітычная сіла краіны.

**УНУТРАНАЯ ПАЛІТЫКА**

1. ЛДПБ заяўляе: Незалежнасць і Суверэнітэт — галоўныя каштоўнасці народа, які дасягнуў пабудовы ўласнай Дзяржаўнасці. Таму ўсе размовы пра неактуальнасць захавання, умацавання, аховы Незалежнасці і Суверэнітэту — павінны спыняцца і аддавацца на грамадскае ганьбаванне.

2. ЛДПБ заклікае: не дапусціць скажэння або перапісу нашай слаўнай гісторыі, ні ў якім разе нельга ўцягваць краіну і народ у «гістарычныя» войны, якія, на жаль, у апошнія гады сталі актуальнымі асабліва ў былых краінах СССР. Мы не маем права дзяліць мінулае — яно ў нас адно.

**ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА**

1. ЛДПБ як партыя дзяржаўнікаў вядзе актыўную работу на міжнародным узроўні і ў выпадку абрання нашых дэпутатаў, толькі ўзмоцніцца ў гэтым кірунку. Мы ўзаемадзейнічаем з буйнымі палітычнымі сіламі Еўрапейскага Саюза, краін блізкага замежжа і Азіі.

2. ЛДПБ за шматвектарную палітыку, мы павінны выбудоўваць узаемавыгадныя адносіны з усімі краінамі як на Захадзе, так і на Усходзе.

3. ЛДПБ актыўна падтрымлівае інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы. І Расія, і Украіна, і Казахстан — нашы браты. Развіццё ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі — вялікі плюс. Разам з тым любыя інтэграцыйныя ўтварэнні, у тым ліку і з Расіяй, павінны быць толькі раўнапраўнымі і ўзаемавыгаднымі.

**САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ СФЕРА**

1. ЛДПБ за рэальнае павышэнне даходаў насельніцтва з ростам цэн і недапушчэнне перыядаў рэзкага падзення рэальнага ўзроўню жыцця людзей.

2. НЕ — беспрацоўю. Неабходна захаваць тыя працоўныя месцы, якія маюцца, а пры скарачэнні — даць іншую магчымасць для працоўнай дзейнасці.

3. ЛДПБ за забеспячэнне гарантый захаванасці ўкладаў насельніцтва, устойлівасці банкаўскай сістэмы краіны, прыцягненне інвестыцый і найноўшых тэхналогій у фінансавы сектар.

4. ЛДПБ выступае за падтрымку вёскі. Трэба развіваць нашу глыбінку: ільготныя крэдыты на жыллё тэрмінам на 20 гадоў, бясплатная зямля, ільготы па аплаце ЖКГ, падатковыя льготы.

5. ЛДПБ за прыватную ініцыятыву. ЛДПБ прапануе ў мэтах стымулявання развіцця сярэдняга і малога бізнесу перадаць пустуючыя адміністрацыйныя памяшканні прадстаўнікам сярэдняга і малога бізнесу, вызваліўшы іх ад арэнднай платы на прымальны для бакоў тэрмін. Для прадпрыемстваў-пачаткоўцаў — падатковыя «канікулы» на 2 гады і даступныя крэдыты. Мы зробім малы бізнес прывабным. Трэба захапіць моладзь, для якой важны не толькі даход, але і сэнс жыцця. Людзі павінны самі жадаць стаць прадпрымальнікамі. «ПРАДПРЫМАЛЬНІК» мусіць гучаць горда!

6. ЛДПБ за працяг пенсійнай рэформы. Трэба адрадзіць працоўную пенсію, у перспектыве правесці персаніфікацыю пенсійных рахункаў і развіваць назапашвальныя фонды, сістэму недзяржаўнага пенсійнага забеспячэння.

7. ЛДПБ бачыць магутны патэнцыял у айчынным турызме. У сувязі з гэтым кожны дэпутат ЛДПБ будзе спрыяць развіццю турызму ў сваім раёне.

8. ЛДПБ падтрымлівае моладзь. Неабходна стымуляваць моладзь рэальнымі заробкамі і сацыяльнай падтрымкай маладых сем'яў, а менавіта ў жыллёвых пытаннях.

9. ЛДПБ за развіццё медыцыны і паляпшэнне стану здароўя нацыі. Першачаргова — даступнасць медыцынскіх паслуг для ўсіх грамадзян незалежна ад статусу і сацыяльнага становішча, а таксама даступнасць замежных лекаў або іх айчынных аналагаў.

**Мы не з уладай і не з апазіцыяй — мы з НАРОДАМ! Толькі ЛДПБ ведае, як зрабіць наша з Вамі жыццё ЛЕПШЫМ! ГАЛАСУЙЦЕ ЗА Караліну Леанідаўну Аўхімовіч!**

■ Экалогія

# Хімічныя адходы — праблема агульная

**Апошнім часам у Беларусі ліквідаваны тры падземныя сховішчы непрыдатных пестыцыдаў, была праведзена іх пераўпакоўка. У выніку колькасць небяспечных хімічных адходаў скарацілася на 17 працэнтаў. У хуткім часе будзе выдзелена яшчэ каля 200 тысяч долараў на ўтылізацыю пестыцыдаў, якія ўтрымліваюць ртуць.**

«У Беларусі застаецца яшчэ каля 10 тысяч тон небяспечных пестыцыдаў, — адзначыла **кіраўнік Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН.** — Але, галоўнае, у беларускіх уладаў ёсць разуменне таго, што гэта пытанне трэба вырашаць. Сховішчы па сутнасці з'яўляюцца бомбай запаволенага дзеяння, ніколі нельга быць упэўненым, што з імі нічога не здарыцца. У ЕС з такімі адходамі былі інцыдэнты, нельга дапусціць іх паўтарэння ў Беларусі. Тым больш, што мы ратуем не толькі вашу краіну, але і ўсю планету ад магчымых наступстваў экалагічнай катастрофы. Гэта наша агульная мэта».

Рэалізацыю праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі, мэтай якога быў вываз небяспечных хімічных рэчываў з тэрыторыі краіны, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пачало ў 2014 годзе. Шэраг яго мерапрыемстваў фінансавалі Еўрапейскі саюз і Сусветная харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН. На ўтылізацыю пестыцыдаў, у прыватнасці, праблемнага сховішча ў вёсцы Мізгіры, што на Слонімшчыне, выдзелілі грант у больш чым 500 тысяч еўра. Памяшканне склада знаходзілася менш чым за 600 метраў ад вёскі, там захоўвалася і ртуць.

«Усяго з гэтага сховішча было вывезена амаль 300 тон небяспечных адходаў, — падвёў вынік працы **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА.** — Я лічу, што рэалізацыя праекта стала прыкладам таго, як мы можам працаваць у партнёрстве з краінамі ЕС, бо фінансаванне праекта адначасова адбывалася і з боку мясцовых бюджэтаў. Такім чынам, ліквідавана адно з самых небяспечных сховішчаў, якое дасталося нам яшчэ з часоў Савецкага Саюза. Мы спадзяёмся, што працяг праекта дапаможа нам утылізаваць астатнія адходы, якія захоўваюцца на складах».

У якасці выканаўцы праекта выступіла французская кампанія «Трэдзі». Менавіта ў Францыю было вывезена 258 тон беларускіх адходаў, яшчэ 26 тон пестыцыдаў з высокім утрыманнем ртуці, знішчэнне якіх у Еўропе пакуль немагчымае, перавезены на больш бяспечны склад у Навагрудскім раёне. Апошнія 26 тон перададуць французскаму боку да 20 жніўня. Такім чынам, склад у Мізгірах будзе цалкам ліквідаваны.

«Мы вельмі рады, што менавіта французская кампанія была выбрана для выканання такой місіі, — прызналася **Першы Саветнік Пасольства Францыі ў Беларусі Эльза ПІНЬЁЛЬ.** — Мы атрымалі міжнароднае прызнанне ў сферы перапрацоўкі адходаў. Хачу адзначыць, што наш праект — доўгатэрміновы, а яго задача — перадаць вопыт і веды беларусам, каб вы маглі самастойна займацца рашэннем гэтай праблемы».

Андрэй Каўхута расказаў, што ўжо сёлета ў Беларусі плануецца зацвердзіць стратэгію абыходжання з адходамі да 2035 года. Цяпер дакумент знаходзіцца на дапрацоўцы з улікам пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю іншых органаў: міністэрстваў прамысловасці, сельскай гаспадаркі і харчавання, аховы здароўя.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Адукацыя

## КОНКУРС НА ЮРЫСТА — 11 ЧАЛАВЕК НА МЕСЦА

**Юрыдычны каледж Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падвёў вынікі ўступнай кампаніі.**

Сёлета дакументы на ўсе формы навучання сюды падалі 586 чалавек, а залічаны былі 196 навучэнцаў. З іх на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі на аснове базавай адукацыі залічаны 25 чалавек. Конкурс сярод прэтэндэнтаў склаў 5,4 чалавека на месца, прахадны бал — 9,6 (у 2015 годзе — 9,5). З 25 залічаных 19 чалавек маюць пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай.

На дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі на аснове сярэдняй адукацыі залічана 25 чалавек. Тут утварыўся конкурс — 10,9 чалавека на месца (летась — 3,1). Прахадны бал — 26,0 (у 2015 годзе — 16,8).

На дзённую платную форму атрымання адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі была пададзена 131 заява, а залічана 76 навучэнцаў. Конкурс — 1,8 чалавека на месца (у 2015 годзе — 1,6), прахадны бал — 8,7 (у 2015 годзе — 8,3).

На дзённую платную форму атрымання адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі конкурс склаў 3,3 чалавека на месца (у 2015 годзе — 1,7). Для навучання на платнай форме абітурыентам неабходна было набраць 22,5 бала (у 2015 годзе — 13,6).

На завочную платную форму навучання залічана 30 навучэнцаў. Тут конкурс — 1,8 чалавека на месца (у 2015 годзе — 2,5). Прахадны бал — 14,0.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение инв. № 440/С-10773 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – мясной павильон), площадью 451,4 кв.м, расположенное по адресу г. Ошмяны, ул. Гольшанская, 79 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 424950100001002448, площадью 0,1289 га (назначение – для содержания и обслуживания здания мясного павильона) по адресу: г. Ошмяны, ул. Гольшанская, 79. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0104 га |
| **Начальная цена продажи** | 156 000 р. (сто пятьдесят шесть тысяч рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 7 800 р. (семь тысяч восемьсот рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, 8-01593-4-44-84 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 20 сентября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений — 14 сентября 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 — Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**


# НЕ ЎСЁ НОСІЦЦА, ШТО БЛІШЧЫЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У продажы знаходзіўся абутак для дзяўчынак з вышынёй абцаса у 1,4—1,8 раза вышэй за норму (па патрабаваннях — не больш за 25 мм). Нашэнне такога абутку можа прывесці да незваротных наступстваў не толькі для ступні, костак ног, але і для пазваночніка, бо апорна-рухальная сістэма дзіцяці толькі фарміруецца. У той жа час абцас вышынёй 1,5—2,5 см карысны, бо пры хадзьбе ён засцерагае ад удараў пятачную частку.

У ліку частых парушэнняў — нізкія паказчыкі гіграскапічнасці і паветрапранікальнасці вырабаў. Эксперты тлумачаць гэта нізкай якасцю ўжываных матэрыялаў. Праверкі часам выяўлялі, што ў сукенках для дзяўчынак паказчык «паветрапранікальнасць» быў у 9 разоў ніжэйшым за ўсталяваную норму. У штанах для хлопчыкаў гэты паказчык таксама аказаўся заніжаны — больш чым у тры разы. У асноўным гэта прадукцыя выраблена за межамі Беларусі.



Фота БЕЛТА.

— Між тым гіграскапічныя ўласцівасці тэкстыльных палотнаў і вырабаў характарызуюць іх здольнасць паглынаць і аддаваць вадзяныя пары, ваду, — тлумачыць **Людміла ПАНКОВА, загадчыца сектара аддзела дзяржаўнага нагляду за тэхнічнымі рэгламентамі і стандартамі ў лёгкай, дрэваапрацоўчай прамысловасці і будіндустрыі інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і горадзе Мінску.** — Гэта адна з найважнейшых фізіка-гігіенічных уласцівасцяў матэрыялу і адзення з яго. Вырабы з тэкстыльных палотнаў з высокай гіграскапічнасцю лепш засцерагаюць чалавечы арганізм, у тым ліку і дзіцяці, ад рэзкіх і таму шкодных змяненняў умоў навакольнага асяроддзя. Такім чынам, невыкананне нормаў і нізкі паказчык гіграскапічнасці ў вырабах з тэкстыльных матэрыялаў не спрыяюць стварэнню нармальных умоў для жыццядзейнасці арганізма дзіцяці.

Адзенне для дзяцей ва ўзросце да 1 года павінна быць выраблена толькі з натуральных матэрыялаў, заяўляюць спецыялісты. Прысутнасць сінтэтычных валокнаў у матэрыялах, якія прымяняюцца для вырабу дзіцячых рэчаў, прыводзіць да зніжэння гігіенічных уласцівасцяў прадукцыі, можа выклікаць скурныя раздражненні, сверб, алергію.

## Партфелі без флікераў і бразготкі з роспісам

У поле зроку інспекцыі Дзяржстандарта таксама трапляюць партфелі, рукзакі вучнёўскія і ранцы. І ў гэтым выпадку парушэнняў, звязаных менавіта з бяспекай дзіцяці, дастаткова: перавышэнне нармаванага значэння масы ранцаў для вучняў пачатковых класаў, адсутнасць дэталяў і (або) фурнітуры са святлоадбівальнымі элементамі на пярэдняй, бакавой паверхні і верхнім клапане вырабу.

Трапілі ў «чорны спіс» і некаторыя цацкі. Пры праверцы дзіцячых пісталетаў з пускавым механізмам выявілі, што ў мяккіх патронах неметалічны наканечнік мае дыяметр 12 мм пры тым, што па патрабаваннях бяспекі гэты паказчык павінен складаці не менш за 20 мм. Здавалася б, што тут такога? Але ж «вастрэйшыя», чым належыць, наканечнікі могуць элементарна траўмаваць дзіця.

А цацкі-бразготкі, якія немаўляты любяць цягнуць у рот, некаторыя «крэатыўныя» вытворцы распісваюць паверсе фарбай (а хто з бацькоў жадае, каб дзіця яе элементарна наелася?). На цацках для немаўлят таксама неправамерна выкарыстоўваўся адзіны знак абарачэння прадукцыі на рынку дзяржаў — членаў Мытнага саюза (ЕАЭС). Часцей за ўсё такія парушэнні былі выяўленыя ў таварах імпартнай вытворчасці.

## Бачаць вочы, што купляюць

Вядома, па выніках праверак прымаюцца меры: ад забароны распаўсюджвання да канфіскацыі небяспечнай прадукцыі. На сайце Дзяржстандарта пастаянна абнаўляюцца рэестры небяспечнай прадукцыі, забароненай да ўвозу і (або) абарачэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці прадукцыі патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (Еўразійскага эканамічнага саюза), дзеянне якіх спынена на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Але і самі спажыўцы павінны быць пільнымі і думаць перш за ўсё пра здароўе і бяспеку дзіцяці. Напрыклад, пры выбары дзіцячага абутку спецыялісты раяць не гнацца за моднымі тэндэнцыямі, а аддаваць перавагу правільнаму і зручнаму. Лепш набываць абутак з натуральных матэрыялаў: скуры або якаснага тэкстылю. Дзіцячая ступня часта пацее, асабліва, калі туфлі цалкам закрытыя. Для гэтага ў «правільным» абутку прадугледжаны спецыяльныя вусцілкі з матэрыялу, які паглынае лішак вільгаці, звычайна са скуры або з тканіны. Вельмі важны момант — наяўнасць супінатара, які папярэджвае плоскаступнёвасць і фарміруе нармальны абрыс ступні. Да падэшвы дзіцячага абутку таксама прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні. Яна павінна быць гнуткай, бо «драўляная» падэшва абцяжарвае рух пры хадзьбе і павышае стамляльнасць дзіцяці; тонкай, каб малому лёгка было ўтрымліваць раўнавагу (але ў зоне абцаса тонкая падэшва недапушчальная); амартызуючай, каб кампенсаваць нагрузку на суставы пры скачках на цвёрдай паверхні.

Пры выбары школьнага партфеля варта звярнуць увагу на яго вагу, каб яна не перавышала дапушчальную норму, на наяўнасць рэгуляваных плечавых рамянёў і святлоадбівальных элементаў. Таксама ён павінен поўнасцю прылягаць да спіны школьніка і забяспечваць раўнамернае размеркаванне вагі, а для дзяцей пачатковых класаў ранцы абавязкова павінны быць забяспечаныя формаўстойлівай спінкай.

Пры выбары дзіцячых цацак бацькам варта звярнуць увагу на ўзрост, для якога прызначана цацка, на наяўнасць павярхоўна афарбаваных элементаў (для цацак, што кантактуюць з ротам дзіцяці), на пах, які можа вылучаць цацка, на наяўнасць дробных і вострых дэталяў і частак, якія вытыркаюцца. У настольна-друкаваных цацках тэкст і малюнкі павінны быць выразнымі і кантраснымі ў адносінах да асноўнага фону.

Спецыялісты раяць адказна падыходзіць да выбару дзіцячай прадукцыі, старанна аглядаць яе, перш чым купіць, дэталёва вывучаць маркіроўку, цікавіцца ў прадаўца характарыстыкамі вырабу, яго вытворцам або пастаўшчыком, а таксама наяўнасцю доказаў, што прадукцыя мае пацвярджэнне адпаведнасці. Калі ж сумненні з'явіліся, ад набыцця такога тавару лепш адмовіцца.

**Дар'я ШОЦІК.**

■ А не шкодзь!

## Сямейнае браканьерства

**У Воранаўскім раёне затрыманы два паляўнічыя-нелегалы — цесць з зяцем.**

Апошні, не маючы пуцёўкі і дазволу, падстрэліў на сельскагаспадарчым полі казулю. Затым мужчыны аднеслі зброю дадому і вярнуліся па тушу. У гэты момант парушальнікаў заўважыў і зняў іх дзеянні на камеру адзін з мясцовых жыхароў. Ён жа і паведаміў пра незаконнае паляванне ў лідскую міжрайінспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету. У браканьераў канфіскавалі тры гладкаствольныя стрэльбы. У адносінах да стралка заведзена крымінальная справа за незаконнае паляванне, якое пацягнула нанясенне шкоды прыродзе ў буйным памеры. Нелегалу давядзецца пакрыць 2520 дэнамінаваных рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

## Медальны звон

**Чатыры ўзнагароды (два сярэбраныя і два бронзавыя медалі) заваявалі прадстаўнікі беларускай школы на 28-й Міжнароднай алімпіядзе школьнікаў па інфарматыцы. Інтэлектуальныя спаборніцтвы праходзілі ў Казані і сабралі ўдзельнікаў з 82 краін свету. Яшчэ пяць краін прысутнічалі ў ролі назіральнікаў.**

Міжнародная алімпіяда па інфарматыцы (IOI) упершыню была праведзена ў 1989 годзе. Цяпер удзел у ёй прымаюць больш за 300 школьнікаў штогод. «Прасунутыя» навучэнцы «змагаюцца» за сваімі камп'ютарамі індывідуальна. Рэйтынг удзельнікаў вызначаецца па сумарных балах за два туры спаборніцтваў.

Залатыя медалісты вызначаюцца з ліку першых у рэйтынгу 8% удзельнікаў. Абсалютным чэмпіёнам становіцца той, хто набраў максімальную колькасць балаў. Наступныя ў рэйтынгу ўдзельнікі становяцца сярэбранымі і бронзавымі прызёрамі (у адпаведнасці з квотамі), але ўсяго медалямі ўзнагароджваецца толькі палова ад агульнай колькасці «алімпійцаў».

Сярэбраныя ўзнагароды на 28-й Міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы заваявалі выпускнік ліцэя БДУ Міхаіл Наталевіч і Фёдар Карабейнікаў з гімназіі №51 горада Гомеля. Бронзавыя медалі — у выхаванцаў сярэдняй школы №8 горада Віцебска Ільі Мядзянікава і Артура Петухоўскага. Каманду школьнікаў рыхтавалі да спаборніцтваў дацэнт кафедры інжынернай псіхалогіі і эрганомікі БДУІР Ірына Кірыновіч і старшы выкладчык кафедры вылічальнай матэматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Тоўсцікаў.

У наступным годзе алімпіяда пройдзе ў Тэгеране.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## МЫТНАЯ СЛУЖБА І... ВАКАЛЬНЫ ТАЛЕНТ

**Беларускія мытнікі паспяхова выступілі на фестывалі мастацтваў «Залаты Кадуцэй».**

Гэты фестываль праводзіцца ўжо 21 год запар, а сёлета ён набыў статус міжнароднага. У гала-канцэрце фінальнага этапу ў расійскім горадзе Ліпецку ўдзельнічалі 150 пераможцаў паўфіналаў. Журы ацэньвала выступленні ў 13 намінацыях, сярод якіх вакал, танец, арыгінальныя пастаноўкі, чытальнікі... У намінацыі «Сольны вакал» другога месца ўдастоены **начальнік аддзела мытных расследаванняў Гродзенскай рэгіянальнай мытні Сяргей ДАЎГУН.**

— Ён выступіў з песняй «З вайны», уразіўшы сваім вакальным талентам журы і ўдзельнікаў конкурсу, — кажа **прэс-сакратар Гродзенскай рэгіянальнай мытні Юлія РАМАНЮК.**

У намінацыі «Жаночы сольны вакал» трэцяе месца ў **галоўнага інспектара арганізацыі мытнага кантролю Брэсцкай мытні Ганны САМЦЭВІЧ.**

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# АРКУШЫ ПРАЎДЫ,

## або «Міна запаволенага дзеяння»

### Удалося адшукаць рукапісы пятага — не выдадзенага — нумара падпольнай «Звязды»

**Газета «Звязда» — адно з нямногіх перыядычных выданняў Беларусі, якое выходзіла ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне выхаду газеты ў акупаванай сталіцы стала не толькі падзеяй у гісторыі мінскага падполля, а і вялікім подзвігам журналістаў-падпольшчыкаў. У занятым ворагам Мінску ўбачылі свет чатыры нумары «Звязды». Пяты нумар быў набраны і звярстаны — яго выпуск планаваўся на 27 верасня 1942 года. Аднак у свет ён так і не выйшаў. За дзень да выхаду гітлераўцы арыштавалі 21 падпольшчыка, сярод якіх быў і тагачасны рэдактар газеты Вячаслаў Нікіфараў. Многія з іх былі закатаваны да смерці, лёс некаторых невядомы і дагэтуль...**



Помнік журналістам-падпольшчыкам узведзены на мінскай плошчы Незалежнасці.

Не адно пакаленне «звяздоўцаў» марыла адшукаць гэты ракавы — пяты — нумар падпольнай газеты, над якім, як і над іншымі чатырма, рызыкуючы сваім жыццём, руплiва працавалі журналісты-падпольшчыкі. Ён мог бясследна знікнуць, што цалкам верагодна, або быць прысвоеным фашыстамі. А можа, падпольшчыкі паспелі яго схаваць?

Пра гэта мы ўжо ніколі не даведаемся. Ды і наўрад ці ўбачым калі гэты нумар. Затое ў нас з'явілася магчымасць дазнацца, пра што ў ім хацелі расказаць журналісты. Напісаныя ад рукі аркушы, якім больш за 70 гадоў (!), удалося адшукаць у Нацыянальным архіве Беларусі. Выведзеныя ад рукі алоўкам, яны стварaліся не адным аўтарам — пра гэта сведчаць розныя почыркі. Беларускамоўныя і рускамоўныя матэрыялы ўжо падрыхтаваныя да друку — шматлікія пазнакі і рэдактарскія праўкі ўказваюць, што над тэкстамі ўжо нехта папрацаваў. Дык што ж хацелі паведаміць насельніцтву журналісты апошняга падпольнага нумара «Звязды»?

### Жыццё пад рэформай

Перада мной — артыкул пад назвай «Зямельная рэформа» — гэта прыгонніцтва». «Нямецкія фашысты з'яўляюцца рэакцыянерамі-прыгоннікамі, а нямецкая армія — арміяй прыгонніцкай, якая пралівае сваю кроў дзеля ўзбагачэння нямецкіх баронаў і ўстанаўлення ўлады памешчыкаў», — публікацыя пачынаецца з цытаты Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

«Фашысцкія правіцелі самі не тояць таго, што яны вядуць вайну за беларускія землі, каб надзяліць імі нямецкіх баронаў і памешчыкаў, — пагаджаецца з Іосіфам Сталіным аўтар. — Услед за ўзброенымі ордамі гітлераўцаў гэтыя бароны і памешчыкі пад выглядам розных інструктараў і сельскагаспадарчых афіцэраў чорнай халерай наляцелі на Беларусь. Як тыя драпежнікі ў пошуках здабычы, яны шныраць па нашым краі, адбіраюць у сялян лепшыя землі і ствараюць памешчыцкія гаспадаркі, у якіх уводзяць прыгонніцтва, у шмат разоў горшае, як тыя, што існавалі ў Расіі да 1861 г.»

З публікацыі становіцца зразумела, што гітлераўцы і іх памочнікі праз свой прададжны лісток (як называюць «Беларускую газэту» мінскія падпольшчыкі, не шкадуючы фарбаў) распісваюць гэтую «Рэформу» і заклікаюць беларускіх сялян да супрацоўніцтва з імі. На сваіх лістоўках-плакатах яны змяшчаюць выявы прыгожых парадзістых кароў, свіней і не менш парадзістых, нават пузатых, немцаў. Глядзіце, маўляў, беларусы, як жывецца немцам!

«Усё гэта яўная хлусня, — пераконваюць сваіх чытачоў карэспандэнты падпольнай «Звязды». — У Германіі жывецца добра памешчыкам і капіталістам, яны іх і малююць у сваіх плакатах. Сяляне! Бярыцеся за зброю. Ганіце фашысцкую погань з вашай зямлі разам з іх «Зямельнай рэформай».



**Пяты нумар падпольнай «Звязды», як і чацвёрты, ствараўся ў хаце Пятра і Альбіны Хадасевічаў на сучаснай вуліцы Беламорскай. Пасля няўдалай спробы выхаду газеты гаспадары, а таксама іх сыны Косця і Павел, былі схоплены фашыстамі і адпраўлены ў Трасцянец. Не стала іх у канцы 1942 года...**

### Германія — краіна памешчыкаў

Людзі, якія выпускалі газету ў такі складаны час, былі надзвычай дасведчанымі. Пра гэта, напрыклад, гаворыць цікавы факт, прыведзены ў нумары: «Па дадзеных перапісу 1939 года, у фашысцкай Германіі памешчыкі, якія складаюць толькі адзін працэнт ад усяго сялянства, валодаюць 37 мільёнамі гектараў зямлі. З іх 34 тысячы памешчыкаў валодаюць 15 мільёнамі гектараў, а 413 буйных зямельных уладароў маюць у сярэднім па 6,775 га зямлі кожны, а 1721 дробная нямецкая сялянская гаспадарка мае ў сваім карыстанні толькі 3,5 мільёна гектараў — менш чым па 2 га на гаспадарку. Мільёны нямецкіх сялян зусім не маюць зямлі, а толькі арандуюць яе».

Далей — пайменна — пералічваюцца самыя буйныя памешчыкі Германіі. Цікава, што за інфарматары былі ў падпольшчыкаў?

### «Ворага б'ём трапна, без промаху»

Журналісты не баяцца хваліць партызанаў, падрабязна апісваюць іх подзвігі. У мэтах канспірацыі імёны ў матэрыялах не ўказваюцца. Напрыклад, «актыўна і самааддана працуе ў партызанскіх атрадах моладзь. Так, у партызанскім атрадзе камсамольца-лейтэнанта Т.М. за кароткі час партызаны-камсамольцы пусцілі пад адкос 6 вайсковых эшалонаў ворага разам з яго тэхнікай і жывой сілай. Акрамя гэтага, яны падарвалі тры аўтамашыны і спалілі два стратэгічныя масты, чым спынілі усялякі рух па гэтай дарозе на трое сутак». Або «выдатна працуюць па дастаўцы зброі ў атрад і камсамольцы Б. і Г., за што яны атрымалі падзяку ад камандзіра атрада».

Баявая дзейнасць партызан вельмі раздражняла фашыстаў. «Не маючы магчымасці спыніць магутны партызанскі рух, яны сваю злосць вымяшчаюць на мірным насельніцтве, — сведчыць «Звязда». — Нядаўна яны збілі да паўсмерці селяніна З. з вёскі Б. (Мінская вобласць) толькі за тое, што ён адмовіўся паказаць месцазнаходжанне аднаго партызанскага атрада. У вёсцы Л. (Мінская вобласць) нямецкія насільнікі забілі гумавай плёткай двухгадовую дзяўчынку Людачку, вінаватасць якой заключалася ў тым, што яе маці пайшла абараняць сваю радзіму».

Але беларусаў не запалохаеш. Нягледзячы на зверскі тэрор гітлераўцаў, мірнае насельніцтва ўсё роўна дапамагала партызанам. «Так, 80-гадовы стары, рызыкуючы сваім жыццём, з гонарам выконвае баявыя даручэнні партызан, — піша аўтар Міхаіл і дадае, што разам з баявой дзейнасцю партызаны праводзяць сярод насельніцтва агітацыйна-масавую работу. — І кляніцца не складаць зброі да таго часу, пакуль не будзе знішчаны апошні гітлераўскі салдат».

Іншы артыкул спадара Міхаіла вельмі пашкоджаны часам. Карціна вымалёўваецца дзякуючы наступным уцалелым радкам: «дзе б ні былі партызаны, немцы самі заяўляюць, што ў тыле жыць для нас больш небяспечна, чым на перадавой», «штодзённа ляцяць пад адхон эшалоны праціўніка з тэхнікай і жывой сілай», «партызаны-камсамольцы пераўтвараюць нямецкіх шафёраў у «лётчыкаў», падрываючы аўтамашыны праціўніка»... Тэкст падпісаны 24 верасня 1942 года. Праз два дні падпольшчыкаў арыштуюць...

### Подзвіг «дунаеўцаў»

Аўтарамі падпольнай «Звязды» часта станавіліся ўдзельнікі ваенных падзей.

«На днях аб'яднанымі сіламі двух партызанскіх атрадаў імя Чапаева і імя Шчорса, пад кіраўніцтвам вопытных камандзіраў, была па-майстэрску праведзена баявая аперацыя ў мястэчку Узда, — піша чалавек за подпісам «камандзір атрада Дунаеў». — Нягледзячы на спрыяльныя ўмовы ў мясцовасці, перавагу ў жывой сіле і тэхніцы ў ворага, партызаны выбілі з раённага цэнтра ўсіх немцаў і раённую паліцыю, разграмілі ўсе нямецка-паліцэйскія ўстановы, знішчылі базы з гаручым і аўтамашынамі».

Вядома, што той бой працягваўся тры з паловай гадзіны. Пад магутным націскам партызан немцы вымушаны былі выклікаць сабе на дапамогу авіяцыю. Але нямецкія самалёты не напалохалі партызанаў. Дастаткова смела па тым часе ў канцы артыкула пералічваюцца тыя, хто вызначыўся пры правядзенні аперацыі.

Дарэчы, аўтар гэтых радкоў — дастаткова вядомы сёння партызанскі камандзір. Дунаеў — толькі псеўданім. Звалі камандзіра партызанскага атрада імя Чапаева Іванам Тараховічам. У красавіку 1942 года з вайскоўцаў, якія трапілі ў акружэнне, і жыхароў некаторых вёсак у Капыльскім раёне ён арганізаваў партызанскі атрад, які ўжо ў маі ўвайшоў у склад брыгады імя Варашылава. Байцоў атрада ў акрузе ведалі як «дунаеўцаў», а самога камандзіра называлі глускім Чапаевым. Выпадковасць ці не, але яго не стала той жа восенню, што і журналістаў-падпольшчыкаў...

### Вершаваная праўда

Важнае месца ў падпольнай газеце адводзілася і для творчасці. Нават у гады ваеннага ліхалецця выдаўцы лічылі вельмі важным існаванне так званай літаратурнай старонкі. Толькі пісалі цяпер на адну тэму.

У гэтым нумары публікуецца паэма Сяргея Міхалкова «Дзецям акупаваных абласцей». Вось некалькі радкоў:

*Летней ночью на рассвете,*
*Когда мирно спали дети,*
*Гитлер дал войскам приказ*
*И послал солдат немецких*
*Против всех людей советских*
*Это значит — против нас...*

*...Мы с тобой починим парты*
*И покрасим в новый цвет,*
*Склеим порванные карты,*
*Склеим Пушкина портрет.*
*Мы побелим стены в хате*
*И проветрим города.*
*Все вернет, за все заплатит*
*Побежденная орда...*

Побач з творам — зварот да школьнікаў: «... Дзеці! Бярыце прыклад з геройчных братоў па класе. Дапамагайце вашым бацькам, братам і сёстрам у іх усеагульным змаганні з фашызмам. Выяўляйце ворагаў народа, подлых прыхвасняў нямецкіх прыхільнікаў. Дапамагайце дарослым распазнаваць праваКатараў і здраднікаў радзімы. Смерць гітлераўскім катам! Няхай жыве найлепшы сябар і настаўнік дзяцей — любімы Сталін!»

### Выкрыванне здраднікаў

Самы вялікі артыкул «Слова праўды аб тым, хто такія «Прадстаўнікі Беларускага народа» і да чаго яны імкнуцца» прысвечаны здраднікам. Ужо тады гэтыя імёны былі вядомымі па меншай меры журналістам-падпольшчыкам. Магчыма, каб газета ўсё ж такі выйшла ў свет, многія беларусы не трапілі б у пастку гэтых зладзеяў.

«... Адна з такіх шпіёнскіх арганізацый была створана фашыстамі ў 1933 годзе ў мястэчку Стоўбцы, — гаворыцца ў артыкуле. — Працавала яна пад бяскрыўднай назвай «Бюро просьбаў», а насамрэч гэта быў яўвачны шпіёнскі пункт. Кіраўніком яго быў Фабіян Акінчыц — правадыр беларускіх фашыстаў у Заходняй Беларусі. Гэты здраднік, каб увайсці ў давер народных мас, прабіраецца ў шматлікую арганізацыю — у «Грамаду» і стараецца ўзарваць яе знутры. Выдаючы сябе за вялікага мучаніка, ён нават трапіў у турму, але дрэнна схаваў свае воўчыя кіпцюры. Яго хутка распазналі, і ён вымушаны быў уцячы з Беларусі да свайго гаспадара — Гітлера. А цяпер гэты прадажны сабака стаіць на чале беларускіх фашыстаў і заклікае наш народ да супрацоўніцтва з нямецкімі захопнікамі».

Вось што пішуць журналісты пра яшчэ аднаго вядомага сёння здрадніка: «... Уладзімір Казлоўскі — гэта бяздарная малапісьменная тупіца. Толькі дзякуючы таму, што паслухмяны, у Акінчыца ён стаў рэдактарам цэнтральнага органа беларускіх фашыстаў — «Беларускай газэты».

Расказваецца ў газеце і пра ксяндза Гадлеўскага, які выдае газету «Беларускі фронт», накіраваную на барацьбу з масавым рухам, пра Юльяна Саковіча, кіраўніка паліцэйскіх банд у Мінску, Ю. Сабалеўскага, бурмістра Баранавіч, пра яго сябра Рагулю, былога сенатара Польшчы, «гаспадара» Барысава Станкевіча і іншых фашысцкіх памочнікаў.

***

Відавочна, калі б гэты нумар падпольнай «Звязды» выйшаў у свет, адбыўся б сапраўдны інфармацыйны «выбух». Журналісты на старонках газеты не толькі выкрывалі фашысцкіх памагатых і хлуслівую палітыку ворага ў дачыненні да мірнага насельніцтва, але і апісвалі подзвігі партызанаў, а значыць — распальвалі на папалненне радоў народных мсціўцаў... Гітлераўцы не маглі гэтага дапусціць. Таму, захапіўшы падпольную рэдакцыю, наўрад ці пакінулі сведкаў у жывых. А тым больш наўрад ці захавалі газету, якая ў той час была для іх раўназначна міне запаволенага дзеяння.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

**Янушковичский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов**
**22.09.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 11, кадастровый номер 623288016101000063 | 0,1070 | | 2067 руб. 69 копеек | 469 руб. | 1318,47 + расходы за рекламу |
| 2 | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 10, кадастровый номер 623288016101000069 | 0,1071 | | 2067 руб. 69 копеек | 469 руб. | 1314,27 + расходы за рекламу |
| 3 | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 13, кадастровый номер 623288016101000064 | 0,1285 | | 2480 руб. 85 копеек | 496,17 руб. | 1370,01 + расходы за рекламу |

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171104 АСБ «Беларусбанк», код 795, УНП 600181536, ОКПО 04431642 Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится 29.09.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 24.09.2016 г. (последний день подачи заявления 23.09.2016 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99.**

■ Праблемы і рашэнні

# ЁСЦЬ ТАВАР. А ДЗЕ КУПЕЦ?

## Чым можа дапамагчы фермерам дзяржава

**У Мінскай вобласці зарэгістравана каля 800 прыватных сельгаспрадпрыемстваў. Толькі за апошнія пяць гадоў колькасць фермераў павялічылася на 35%. Гэтаму садзейнічае палітыка абласных улад. У прыватнасці, па даручэнні старшыні Мінаблвыканкама, у кожным раёне сфарміраваны фонд зямель для прадастаўлення сялянскім (фермерскім) гаспадаркам і людзям, што маюць вопыт прадпрымальніцкай дзейнасці. Тут можна арганізаваць вытворчасць экалагічна чыстай прадукцыі, заняцца агратурызмам. Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў Стаўбцоўскім раёне ў паспяховага бізнесмена — кіраўніка фермерскай гаспадаркі «Мой сад» Уладзіміра ШЧАКАЛЫ і высветліла, як яму працуецца, з якімі праблемамі сутыкаецца, і, наогул, ці ёсць перспектывы ў фермераў вобласці.**



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Цяжка паверыць, што тут, непадалёку ад вёскі Цвіркі, яшчэ чатыры гады таму было пустое калгаснае поле. А цяпер раскінуліся дзівосны сад і плантацыі чорнай парэчкі. Уладзімір Аляксандравіч вырошчвае яблыкі і чорныя парэчкі польскай селекцыі сорту Tisel. Чаму менавіта спыніўся на іх, тлумачыць так: чорная парэчка ўтрымлівае ўвесь комплекс вітамінаў, які не прысутнічае нават у аптэцы. Столькі спажыўных рэчываў няма ні ў адной ягадзе. Але беларусы пакуль гэтага не ацанілі. Спажываюць усё, што прыгожа выглядае, але не такое карыснае. Не цікавіць чорная парэчка і рознічны гандаль. Першыя два гады Уладзімір Шчакала спрабаваў дастукацца да сеткавых крамаў, але безвынікова. А вось у Расіі за прадукцыяй беларускага фермера пакупнікі стаяць у чэргах. Геаграфія продажу даволі шырокая — Анапа, Варонеж, Растоў-на-Доне, Арол, Самара, Санкт-Пецярбург, Масква. Парадокс, што свая прадукцыя не запатрабаваная на прасторах Айчыны. У той жа час імпарт гародніны і садавіны расце. Натуральна, што такая сітуацыя хвалюе як сельгасарганізацыі, так і фермераў.

Наконт пашырэння сваіх уладанняў Уладзімір Шчакала пакуль не задумваецца. «Сто гектараў зямлі мне дастаткова. Ахапіць больш — ні рук, ні сіл не хопіць. Галоўнае, правільна і эфектыўна асвоіць гэтыя плошчы і атрымаць тое, што хочацца», — кажа ён.

Што тычыцца падтрымкі фермерства, то яна ёсць. «Перш за ўсё дзякуючы Указу Прэзідэнта Беларусі №146, які даў магчымасць набываць сучасную тэхніку і абсталяванне ў ААТ «Прамагралізінг» пад два працэнты гадавых. Праблем з машынамі і агрэгатамі ў нас няма: маем 7 трактароў, неабходнае навяснное абсталяванне. Акрамя таго, паводле дэкрэта кіраўніка дзяржавы малыя прадпрыемствы, зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці, вызваляюцца ад мытных плацяжоў, падатку на дабаўленую вартасць. Гэта вялікая падмога. Разам з тым пажадана, каб дзяржава падтрымлівала фермераў датацыямі, як, напрыклад, у Расійскай Федэрацыі. У адваротным выпадку не ўгонімся за суседкай, страцім рынкі збыту», — лічыць мой суразмоўца.

Уладзімір Аляксандравіч нібы зараджае людзей сваёй энергіяй, захапленнем справай, да якой прыйшоў не так даўно — 4 гады таму. Раней ён займаўся іншым бізнесам — грузаперавозкамі, але закрыў яго і пачаў новы з чыстага ліста. Ды за адносна кароткі прамежак часу зрабіў столькі, колькі іншыя дабіваюцца на працягу многіх гадоў. Уладзімір Шчакала асвоіў і няпрофільныя для садавода вытворчасці, у прыватнасці выпуск слупоў для саду, мадэрнізаваў кантэйнеры для захоўвання яблык. Можна было б іх купіць, але ў гэтым выпадку яны абышліся б значна даражэй.



У фермера ўсё прадумана. І нават ахоўная паласа высаджана не з елкі, а з бярозы. Праз сем гадоў ён плануе здабываць сок.

— Што прывяло інжынера-энергетыка па спецыяльнасці да «Майго сада»: жаданне стаць багатым, рамантыка? — пацікавілася ў кіраўніка фермерскай гаспадаркі.

— Чалавек павінен нешта мяняць у сваім жыцці, нельга таптацца на адным месцы. Сямнаццаць гадоў у грузаперавозках, колькі можна! Там дасягнуў усяго, чаго хацеў. Захацелася нечага новага, цікавага. Перш чым пачаць справу, доўга прыглядваўся, думаў. Ёсць прымаўка, што на зямлі станеш гарбатым, а не багатым. Нядаўна пагледзеў па тэлебачанні інтэрв'ю кіраўніка фермерскай гаспадаркі «Цнянскія экапрадукты» Уладзіміра Адамовіча, які сказаў, што багатым яшчэ не стаў, але гарбатым — таксама. Гэтак жа і я», — засмяяўся Уладзімір.

Прадпрымальнік прызнаўся, што ў яго амбіцыйныя планы, як і ў любога бізнесмена, які хоча шмат дасягнуць. На працягу двух гадоў ён плануе пабудаваць сховішча для садавіны на 2,5 тыс. тон, праектная дакументацыя ўжо праходзіць экспертызу. Марыць ён і запусціць лінію па прыгатаванні сокаў прамога адціскання, а з макухі, што будзе заставацца, выпускаць яблычнае павідла. Словам, наладзіць безадходную вытворчасць. «Усе задумы хачу ажыццявіць на працягу 3-4 гадоў, бо ў часе абмежаваны, мне ўжо 50, доўга цягнуць не магу», — жартуе поўны энергіі і сіл мужчына.

Любы чалавек адчувае замілаванне ад аднаго погляду на сад у любую пару года: вясной, калі ён раскашуе ў бела-ружовай квецені, восенню, калі зачароўвае рознакаляровымі сакавітымі пладамі.

— Канешне, агортвае радасць, калі бачыш, як на тваіх вачах растуць дрэўцы. Але былі і расчараванні. Першы год, калі вёз на сваім грузавіку 5 тон яблыкаў, пайшоў град і пабіў іх. Слёзы наварочваліся на вочы, думаў, навошта мне ўсё гэта трэба, — прызнаецца Уладзімір Аляксандравіч.

Уладзімір Шчакала з тых людзей, хто жыве ў гармоніі не толькі з прыродай, але і са сваімі сумленнем, верай. Ён дапамагае па меры магчымасці мясцоваму праваслаўнаму прыходу, ходзіць у царкву.

— І аб чым вы просіце Бога? — пацікавілася ў яго. — Каб сад рос?

— Хутчэй за ўсё, каб Усявышні паслаў спрыяльнае надвор'е, — адказаў ён.

Пры дарозе, што ідзе паўз сад, узвышаецца невялікая капліца — яе пабудаваў Уладзімір Шчакала. «Калісьці пры ўездзе ў вёску стаялі праваслаўны і каталіцкі крыжы. Гэта навяло на думку ўзвесці тут святыню, каб людзі спыніліся, перахрысціліся, падумалі аб вечным», — адзначыў Уладзімір Аляксандравіч.

Дарэчы, ён не толькі пасадзіў сад, але і гадуе траіх дзяцей: двух дачушак і сына. Калі малы вырасце, магчыма, будзе на каго пакінуць справу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

### У ТЭМУ

**Аркадзь КАЗЯКОЎСКІ, старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Поле дзейнасці для фермераў у раёне вялікае, створаны фонд свабодных зямель. Па меры неабходнасці мы можам выдзяляць іх ахвотным. Для гэтага патэнцыяльнаму фермеру неабходна распрацаваць бізнес-план, звярнуцца ў райвыканкам. Мы ўзгадняем від яго дзейнасці з Мінаблвыканкамам, пасля чаго афармляецца і рэгіструецца зямля. Зноў жа карпатліва вывучаем сітуацыю, выдзяляем участкі не для таго, каб яны зараслі пустазеллем. У раёне зарэгістравана 30 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. У асноўным фермеры займаюцца раслінаводствам, жывёлагадоўляй — адзінкі, рыбаводствам — 1-2, садаводствам — 4. Самыя эфектыўныя з іх — «Мой Сад» і «Сула», якая вырошчвае бульбу. Яны прыносяць аддачу, ствараюць новыя рабочыя месцы, укараняюць прагрэсіўныя тэхналогіі. Тут усё прадумана: як пасадзіць, прывіць, даглядаць культуры, як найлепш выкарыстоўваць хімію ў разумных межах. Прадукцыя «Майго Сада» вытрымлівае любы лабараторны аналіз, яна прыдатная для прыгатавання харчавання, у тым ліку і дзіцячага. Таму няма праблем са збытам. Вось і нядаўна званілі з Піцера, хочуць купіць 400 тон яблыкаў.

***— Чым могуць дапамагчы прыватным гаспадаркам раённы Савет, сельскія саветы дэпутатаў?***

— Найлепшая дапамога — крэдыты для далейшага развіцця. Але гэта не ў нашай кампетэнцыі. Мы садзейнічаем у падборы ўчастка, работнікаў, рашэнні бытавых пытанняў, вядзём работу з людзьмі, калі яны незадаволеныя тым, што побач з іх вёскай чалавеку выдзелілі зямлю.

***— І такія інцыдэнты здараліся?***

— Ёсць у нас прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Профі-Аграцэнтр». Яно створана на базе неплацежаздольнай сельгасарганізацыі «Заямнаўскае». Аднойчы падвозіў да райцэнтра мясцовага жыхара, які абураўся, маўляў, аддалі дзяржаўную маёмасць бізнесменам. Давялося яму тлумачыць, што прадукцыя, якая тут вырошчваецца, застанецца ў Беларусі. Нават, калі яна будзе прададзена за мяжой, то грошы ўсё роўна паступяць у наш бюджэт. Па-другое, уласнік стварыў новыя рабочыя месцы для тутэйшых людзей. Па-трэцяе, у прыватным сектары пры фінансавых укладаннях укараняюцца прагрэсіўныя тэхналогіі. Ды і наогул, як паказвае практыка, калі на зямлю прыходзіць фермер, то ўзровень вытворчасці павышаецца. Акрамя таго, калі зямля не апрацоўваецца 2-3 гады, то яе адбіраем і перадаём таму, хто гаспадарліва да яе адносіцца. І чалавек пагадзіўся са мной, што сапраўды ў гэтым ёсць сэнс.

***— Ці ёсць цікавасць у раёне да фермерства?***

— Не скажу, што стаіць чарга. Але людзі звяртаюцца. Ёсць у нас і фізічныя асобы, якія маюць вопыт прадпрымальніцкай дзейнасці. Яны вырошчваюць агародніну, і даволі паспяхова. Забяспечваюць прадукцыяй школы, сады. А наогул з грамадзянамі трэба яшчэ працаваць, прыцягваць іх да справы. І ў гэтым могуць дапамагчы саветы дэпутатаў.

■ Гэта цікава

# ЖЫЦЦЁ ПЧОЛ... У РЭЖЫМЕ ONLINE

## Убачыць можа кожны



Жыццё пчол — на экране камп'ютара.

**У артыкуле «Пчаліны дамок» (22 ліпеня 2016 г.) мы расказалі пра апііngаляторый Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, які прызначаны для выкарыстання ў аздараўленчых мэтах вуллёвага паветра. Там жа, на доследным пчальніку, ёсць і яшчэ адна «фішка». У адным з вуляў устанавілі вэб-камеру, і за жыццём пчалінай сям'і зараз кожны можна назіраць у рэжыме Online (ggau.by/cambee).**

Разам з **навуковым супрацоўнікам па пчалярстве Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдатам сельскагаспадарчых навук Мікалаем ХАЛЬКО** і малодшым навуковым **супрацоўнікам Станіславам ЛЯПЕЕВЫМ** падыходзім да пчалінай калоды, дзе размешчана вэб-камера.

— Гэтаму дрэву, напэўна, гадоў 200, не менш, — лічыць Мікалай Халько. — Такіх гістарычных калод у Беларусі засталося няшмат. Добра, што гэтую не пасеклі на дровы.

Калоду, якая някепска захавалася (толькі даху не было) прывезлі з Піншчыны і разгружалі на ўніверсітэцкім пчальніку з дапамогай крана. Потым туды засялілі пчол міралюбівай пароды, каб не стваралі праблем навакольным, і ўстанавілі вэб-камеру. Навошта?

— І нам, навукоўцам, цікава назіраць за жыццём пчалінай сям'і ў рэжыме рэальнага часу (пры гэтым не трэба заглядваць у вулей, трывожыць пчол), і нашым студэнтам, пчалярам, — кажа Мікалай Халько. — А асаблівa дзецям, якія будуць ведаць, што сабой уяўляюць пчолы, чым яны займаюцца.



Фота Барыса ПРАКОПЧЫКА.

У гэтай старадаўняй калодзе ўстанавілі вэб-камеру.

Чым жа займаліся насельнікі старадаўняй калоды ў той ліпеньскі дзень? Мікалай Віктаравіч запрашае да камп'ютара. Першае ўяўленне: няспынны рух пчол у розных, здаецца, выпадковых кірунках. Але каментарый спецыяліста дапамагае зразумець, што ўсё тут падпарадкавана дакладнай сістэме.

— Гэта толькі здаецца, што пчолы рухаюцца хаатычна, а на самай справе ўсе яны занятыя той ці іншай справай, — тлумачыць Мікалай Халько. — Ідзе напружаная работа. Напрыклад, вось гэтыя пчолы будуюць соты, а хтосьці чысціць ячэйкі, наводзіць парадак унутры калоды. Альбо вось пчала, якая прынесла пылок. А гэтая, мечаная пчала, — матка. У пэўны перыяд можна нават убачыць, як ідзе расплод.

Дарэчы, гэтую трансляцыю з калоды (з вясны да восені, калі пчолы найбольш актыўныя) можна было б вывесці і на вялікі экран у цэнтры горада — магчыма, падчас мядовых кірмашоў, нейкіх дзіцячых імпрэз. Ды і турыстам, пэўна, будзе цікава ўбачыць гэтую гродзенскую «фішку».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

prakopchik@zviazda.by

■ За падзеяй

# Усе музеі пад адным дахам

## МАГІЛЁЎ РЫХТУЕЦЦА ПРЫНЯЦЬ ДВА КУЛЬТУРНЫЯ ФОРУМЫ

У хуткім часе, з розніцай у некалькі тыдняў, Магілёў стане пляцоўкай для дзвюх значных культурных падзей — трэцяга Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі» і пятага міжнароднага форуму «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства». Каб гэтыя праекты прайшлі на высокім узроўні, у Магілёве абмеркавалі ўсе нюансы, звязаныя з іх падрыхтоўкай і правядзеннем. У пасяджэнні прыняў удзел намеснік міністра культуры Беларусі Васіль ЧЭРНІК.

— Такія 2 вялікія мерапрыемствы не выпадкова праходзяць у Магілёве, таму што вобласць апошнія 3 гады была пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва на найлепшае культурнае абслугоўванне насельніцтва, — падкрэсліў ён.

На ўдзел у форуме «Музеі Беларусі» ўжо заяўлена больш за 100 дзяржаўных, ведамасных, школьных музеяў. На пасаду старшыні аргкамітэта запрошана генеральны дырэктар Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі Зельфіра Трэгулава. У Магілёў прыедуць эксперты з Расіі, Украіны, Польшчы, Швецыі. У межах форуму пройдуць прэзентацыі, музейныя праграмы, выставы. Запланавана вялікая дзелавая частка, падчас якой музейшчыкі змогуць знайсці для сябе шмат новага і карыснага.

**Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір ПРАКАПЦОЎ** паведаміў, што вельмі важна паказаць тыя набыткі, якіх дасягнулі нашы музеі за апошнія 2-3 гады. «Сёння музеі цесна працуюць з наведвальнікамі, выходзяць за сцены сваіх устаноў, рыхтуюць інтэрактыўныя праграмы, — кажа ён. — Мы актыўна супрацоўнічаем з музеямі Еўропы. Нядаўна закрылася наша выстава праваслаўных і каталіцкіх ікон у Ватыкане».

Месцам правядзення маштабнага музейнага форуму ў Магілёве стане спартыўны комплекс «Алімпіец». Тут будзе ўнікальная магчымасць здзейсніць захапляльнае падарожжа адразу па ўсіх музеях Беларусі.

— Для мяне як для музейшчыка вельмі цікава паглядзець навінкі, наватарскія прыёмы, якія прымяняюць мае калегі ў афармленні самой пляцоўкі, — кажа **загадчыца аддзела этнаграфіі Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея Святлана РЫБАКОВА.** — Музей мае задачу прадставіць сябе мінімальнымі сродкамі на мінімальнай плошчы. Гэта ўнікальная магчымасць атрымаць вопыт, падзівіцца таму, як працуе фантазія, як вырашаюцца складаныя праблемы. Кожны музей імкнецца прывезці інтэрактыўны, гульні з наведвальнікамі — забаўляльныя, сур'ёзныя, павучальныя, жартаўлівыя. Убачыць у зрэзе ўсе музеі Беларусі — гэта цікава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Вернісаж

# «ЖЫВАПІС» АД СЛОВА «ЖЫЦЦЁ»

## Выстаўка карцін Уладзіміра Сайко «Першая чвэрць творчага шляху» адкрылася ў Прэзідэнцкай бібліятэцы

**У свае 25 Уладзіміру сапраўды ёсць чым ганарыцца: ён атрымаў добрую адукацыю ў Беларусі і Расіі, зладзіў некалькі персанальных выставак, заснаваў уласную майстэрню. Карціны маладога чалавека ўжо знаходзяцца ў прыватных калекцыях не толькі на радзіме, але і ў Расіі, Польшчы, Германіі, Францыі, Італіі, Швейцарыі, ЗША, Венесуэле, Кітаі, Іране, Ліване, Эквадоры і ПАР.**

Сярод работ можна вылучыць тэматычныя групы, напрыклад, цыкл, прысвечаны беларускім жанчынам. Гераіні партрэтаў, сталыя і маладыя, намаляваны з натуры і ўвасабляюць беларускі жаночы тыпаж. Сярод іх — дзве выявы бабулі мастака Алімпіяды Ануфрыеўны. Адметна, што ўнук маляваў яе аж 26 разоў, нават правёў асобную выстаўку яе партрэтаў пад назвай «Алімпіяда».

Шмат месца займаюць пейзажы са знаёмымі гледачу беларускімі краявідамі. На выстаўцы прадстаўлены і маштабныя карціны, і эцюды, зробленыя ў парыве натхнення за некалькі гадзін. Разам з вучнямі Уладзімір Сайко выпраўляецца ў падарожжы па родных мясцінах, шукае маляўнічыя пейзажы сярод непралазнага гушчару. «Пленэр — гэта аснова і сэнс жывапісу, — кажа мастак. — Само паняцце «жывапіс» паходзіць ад слова «жыццё», і пленэр дае магчымасць пісаць сярод прыроды».



Уладзімір Сайко. «Восеньскі партрэт».



Уладзімір Сайко. «Беларускія жанчыны. Пражытае жыццё».

Адзін з важных напрамкаў творчасці Уладзіміра Сайко — батальны жывапіс. На карцінах ажываюць падзеі мінулых дзён. Ён стварае палотны і ў сваёй майстэрні, і ў «палявых» умовах, калі выязджае на рэканструкцыі баёў. Па адным з эцюдаў, зробленых падчас рэканструкцыі падзей у лістападзе 1812 года каля вёскі Студзёнка, мастак намаляваў карціну «Беларускія атланты». Вайну 1812 года для Беларусі можна лічыць грамадзянскай, бо жыхары нашага краю змагаліся тады як на баку Расіі, так і на баку Францыі.

Выстаўка ў Прэзідэнцкай бібліятэцы працуе да 31 жніўня.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Кантрамарка

# КОЖНЫ РЭЖЫСЁР ХОЧА ВЕДАЦЬ, ДЗЕ СХАВАЛАСЯ ЧАЙКА

**Калі ў першым акце мужчына страляе з ружжа ў жанчыну, то ў чацвёртым — жанчына страляе ў адказ. У пэўнай ступені перайначаная чэхаўская цытата можа быць ключом да «дэшыфроўкі» «Чайкі» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алега Жугжды.**

Чэхаўская «Чайка» — адзін з самых папулярных класічных твораў у сучаснай беларускай тэатральнай прасторы. З рэпертуару Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек не сыходзіць «Чайка. Вопыт прачытання» Аляксея Ляляўскага, дзе ролі Трэплева і Трыгорына, перакрыжоўваючы лёсы гадоў, выконвае адзін акцёр. Гісторыяй узаемаадносін маці і сына, Аркадзінай і Трэплева, з'яўляецца перад гледачамі «Чэхаў. Камедыя. Чайка» Іскандэра Сакаева ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры. Апакаліпсіс становіцца галоўным героем «Чайкі» Мікалая Пінігіна на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Чым жа адметная інтэрпрэтацыя Алега Жугжды? І чаму «Чайкі» сёння вылятаюць на тэатральныя сцэны адна за другой?

Спектакль Алега Жугжды пачынаецца пралогам, у якім актрысы пераўвасабляюцца ў птушак-чаек, а акцёры цэляцца і страляюць у іх з палак-ружжаў. Заканчваецца сцэнай з кіно: Ніна, нібыта на запаволенай кінастужцы, дастае рэвальвер і, збянтэжаная, страляе ў Канстанціна, страляе ў яго. Рука з рэвальверам — метафара. Рэжысёр сцвярджае не ўласцівую нашаму стэрэатыпнаму ўспрыманню вітальнасць чэхаўскіх герояў. Яны прагнуць жыцця. Аднак «сюжэт для невялікага апавядання» — прыйшоў чалавек, пабачыў іншага чалавека і ад няма чаго рабіць знішчыў — спрацоўвае па прынцыпе даміно: адна касцяшка, якая раптоўна звалілася, цягне за сабой іншыя.

Залежнасць аднаго чалавека ад другога, якая стала акцэнтам спектакля, перадаецца і ў сцэнаграфіі, праз лялек — сучаснай версіяй «жывога» і ляльки ручнага плана. Часам акцёры перадаюць сваю ляльку-блізнятку ў рукі партнёру, падкрэсліваючы залежнасць героя і волю лёсу. Галоўныя героі прымушаюць гледача напружана і марна чакаць. Ад Аркадзі-



**Часам акцёры перадаюць сваю ляльку-блізнятку ў рукі партнёру, падкрэсліваючы залежнасць героя і волю лёсу.**

най (Ларыса Мікуліч) — слабіны і сапраўднасці (але ж яна ніколі не была простай жанчынай, і няма чаго спадзявацца пабачыць яе такой. Нішто не «расколе» яе перад гледачамі). Ад Траплёва (Аляксандр Рацько) — праявы ўпадніцтва. Але Траплёў у Жугжды не хваравіты, неўраўнаважаны юнак, пра якога з першай сцэны зразумела: гэты з сабой абавязкова што-небудзь зробіць — а досыць амбітны малады чалавек, які для сябе самога цалкам змяняе збег абставін. Гэта пачынаеш заўважаць з першай дзеі, з размовы Сорына і Траплёва. Дарэчы, не спяшайцеся паправіць — для рэжысёра важны менавіта такі націск у прозвішчы героя: Траплёў. «Дачны тэатр Канстанціна Траплёва» — пазначае Жугжда ў праграмцы і тут жа, у спісе дзеючых асоб, пазбаўляе герояў любых імёнаў, пакідаючы толькі пэўныя архетыповыя звесткі: актрыса, малады чалавек, яе сын, яе брат і г.д. Рэжысёр скіроўвае гледача да думкі, што яго «Чайка» — гэта гісторыя мужчыны і жанчыны, чалавека і чалавека, у якой, аднак, дэталі ўсё ж маюць значэнне.

Шмат якія з гэтых дэталяў, што транслююць рэжысёрскае прачытанне п'есы, асабістыя стасункі Алега Жугжды з тэкстам, увасоблены ў ляльках (сцэнаграфія Ларысы Мікінай-Прабадзяк). Так, у сцэне, дзе Аркадзіна і Трыгорын высвятляюць адносіны, лялька-белетрыст ператвараецца ў вялізную рыбіну, якая вось-вось выслізне з рук актрысы. Аркадзіна ў гэтай мізансцэне прадстаўлена «жывым планам»: жанчына што ёсць моцы трымае слізкае і гнуткае шчасце ў сваіх руках. І вядома, утрымлівае, бо вопытныя рыбакі пачынаюць і перамагаюць. Ці, напрыклад, калі ў фінале на сцэне з'яўляецца чучала чайкі, глядач пазнае ў ім аблічча Ніны, у нечым карыкатурнае. І адказ на пытанне «А ці была Ніна напраўду таленавітай актрысай, жыццё якой спляжылі?» — відавочны.

**Жыццесцвярджальнасць — гэта невідавочнае, але акурат тое, што цэліць у нас сённяшніх.**

Няма нічога больш нязменнага, чым часовае. Ад настрою спектакля патыхае курортнай лёгкасцю — дачны тэатр сцвярджае аднасезоннасць, імгненнасць сцэн. Дзеянне разгортваецца на драўлянай кладцы над берагам возера. На галовах акцёраў — канацье, над іх галовамі — некалькі экранаў з вывяай чароту, які варушыць вецер. Падаецца, што расказаная гісторыя зляціць разам з ім за шырокую ваду ды густыя туманы. Адвечная песня ветру ў чароце. Яе слухаюць жанчыны, што запісаліся на семінар «Як пазбегнуць мужчынскай здрадау?». Яе слухаюць мужчыны, якія шмат чаго дасягнулі, а мараць толькі пра тое, як на выхадных забыцца пра бізнес ды выцягнуць з вады некалькі вялізных рыбінаў. Яе слухаюць і спяваюць усе, хто хацеў бы разабрацца ў сваім жыцці, дзе на першы погляд нічога не адбываецца.

Ну і калі ўжо пра песні, то «Чайка» Алега Жугжды — гэта як песня Земфіры: «Хочется быть... / Чайка летит. / Чайка, лети». Яе асаблівасці — іронія і жыццесцвярджальнасць. І калі першым цяжка здзівіць, бо Чэхаў ад пачатку вызначыў жанр п'есы як камедыю, то жыццесцвярджальнасць — гэта невідавочнае, але акурат тое, што цэліць у нас сённяшніх. Веганаў і сыраедаў. Ёгаў і бегуноў. І аднача-сова цэліць у нас адвечных — хочацца быць кімсьці і з кімсьці. Хаця і не ва ўсіх гэта атрымліваецца.

Хочацца быць. Чайка, ляці. Стрэл. Заслона.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

**Аркадзь ШПУНТ:**

# «Мы не можам мець поўнага ўяўлення пра старажытнае беларускае мастацтва, затое мы ведаем дакладна: гэта было штосьці вялікае»

## ЧАМУ НАМ НЕАБХОДНЫ ЦЭНТР РЭСТАЎРАЦЫІ

**Да сакраментальнага працэсу рэстаўрацыі твора мастацтва можна падабраць шмат сімвалічных сінонімаў — адраджэнне, ажыўленне, вяртанне. І самую відавочную аналогію — захаванне культурнай спадчыны. У Нацыянальным мастацкім музеі неаднаразова агучвалася ідэя стварэння адмысловага цэнтра рэстаўрацыі, які зможа задаволіць патрэбы ў аднаўленні помнікаў культуры ўсёй краіны. Аркадзь Шпунт, рэстаўратар найвышэйшай катэгорыі, што кіруе навукова-рэстаўрацыйным аддзелам музея, патлумачыў, чаму гэта важна, а заадно крыху распавёў пра сваю працу.**


Фота Надзеі БУЖАН.

— Цэнтры рэстаўрацыі ёсць амаль у кожнай краіне. У суседняй Літве, напрыклад, адпаведныя ўстановы створаны не толькі ў сталіцы, дзе штат рэстаўратараў дасягае ста чалавек, але і ў іншых гарадах. Пажадана было б і нам мець свой цэнтр — мы можам паказаць сапраўдную рэстаўрацыю. Апроч іншага гэта дасць магчымасць атэстоўваць спецыялістаў «дома», а не за мяжой. Гэта не патрабуе капітальных укладанняў, трэба толькі арганізавацца, стварыць атэстацыйную камісію, адзін раз абсталяваць майстэрні і пайсці працаваць. На цэлую краіну нам хапіла б сямідзесяці рэстаўратараў, якіх мы б самі і навучылі.

**У беларускіх творах присутнічае нейкая свабода, аўтары не трымаліся аўтаматыкі і канонаў, дазвалялі сабе вольнасці. Нават рэчы невысокага прафесійнага ўзроўню прыцягваюць сваёй непасрэднасцю.**

***— Якія прывілеі будуць у атэставанага камісіяй рэстаўратара, якіх няма сёння ў супрацоўніка навукова-рэстаўрацыйнага аддзела музея?***

— Гэтая іерархія размяркоўвае правы допуску да твора. Рэстаўратар нясе вялікую адказнасць, можна нават сказаць, перад народам. Ёсць мастацтва, да якога спецыяліст трэцяй катэгорыі можа дакранацца толькі пад назіраннем кіраўніка, другой катэгорыі — пад яго куратарствам, і толькі рэстаўратар найвышэйшай катэгорыі можа працаваць самастойна. Сёння ў цэрквы і касцёлы прыходзяць людзі з сумнiўным узроўнем прафесіяналізму і прапануюць «падмаляваць» іконы. Такім чынам, мы шмат страцілі і яшчэ будзем страчваць. Атэстацыя — гэта не проста «корка», гэта магчымасць кантраляваць працу з помнікамі культуры.

***— Сёння атэстацыю рэстаўратара маюць толькі тыя, хто паспеў атрымаць яе ў савецкія часы?***

— Амаль што так. Рэстаўратараў найвышэйшай катэгорыі ў нас можна на пальцах пералічыць, ёсць спецыялісты першай катэгорыі, якія атрымалі атэстацыю ў іншых краінах. Дарэчы, савецкі атэстацыйны дакумент паважалі за мяжой.

***— Значыць, атрымаць яго вам было складана?***

— Трэба было паказаць вынік сваёй працы. Я атрымаў атэстацыю ў 1985 годзе, за некаторы час да гэтага па ўсім свеце прайшла хваля цікавасці да рэстаўрацыі, ва ўсіх савецкіх рэспубліках былі створаны навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні (у Беларусі, дарэчы, адной з апошніх). У нас была магчымасць ездзіць на стажыроўкі ў Маскву, у добрую школу з класнымі майстрамі. Тады за маю працу мне далі першую катэгорыю, абыходзячы трэцюю і другую. А найвышэйшую катэгорыю маскоўская камісія прысвоіла мне за рэстаўрацыю алтаровай у касцёле ў Пінску.

***— Колькі ў вас зараз вучняў у навукова-рэстаўрацыйным аддзеле?***

— У нас працуе 21 рэстаўратар. Ліcба невялікая, мы не маем спецыялістаў па фарфоры, кнігах, камені. У савецкія часы музеі заказвалі аднаўленне сваіх экспанатаў староннім майстэрням. Калі колькасць такіх устаноў стала набліжацца да нуля, рэстаўрацыя пачала адраджацца ў нас. Наш аддзел — найвялікшая рэстаўрацыйная арганізацыя ў краіне, якая, па сутнасці, выконвае функцыі вучэльні для будучых прафесіяналаў і ўласна цэнтра. Але цэнтр трэба арганізоўваць на дзяржаўным узроўні. У краіне працуе прыкладна 150 музеяў. У кожным, відома, стварыць асобную майстэрню немагчыма, бо патрабуюцца і прафесіяналы, і абсталяванне. Нам было б дастаткова адной арганізацыі ў Нацыянальным мастацкім музеі. Тое, што трэба рэстаўраваць, мы б унеслі ў ліст чакання і планамерна выконвалі работу, мелі б адзіную базу, з гэтымі творамі маглі б працаваць навуковыя супрацоўнікі. Да нас часцяком па дапамогу звяртаюцца музейшчыкі: маўляў, «рэч знікае». І пачынаюцца складанасці — аформіць, заплаціць, вырашыць арганізацыйныя моманты... Насамрэч, не трэба прыдумляць нешта новае, можна ўзяць за ўзор сістэму 1980-х гадоў — на базе нашага аддзела арганізаваць цэнтр, вучыць спецыялістаў, стварыць атэстацыйную камісію. У нас будуецца цэлы музейны квартал — месца б знайшлося, а краіна жыла б з упэўненасцю, што яе культурная спадчына захоўваецца.

***— Ці многа твораў у краіне чакаюць рэстаўрацыі?***

— Захаваўся мізэр. Вось у маёй майстэрні стаіць цудам ацалелая ікона, але трэба разумець, што яна — толькі частка вялікага іканастаса, у якім было яшчэ мінімум пяцьдзесят рэчаў. У беларускім старажытным мастацтве што ні ікона — усё рознае, але мы маем толькі рэшткі.

***— Вы ўжо сорак гадоў працуеце са стражытнабеларускім мастацтвам, вы можаце вылучыць яго асаблівасці?***

— Нам уласцівая змешаная тэхніка, выкарыстанне розных матэрыялаў. Можна заўважыць уздзеянне розных кірункаў — жывапісу Валыні, праваслаўнай рускай культуры, ракако і барока. Мяне заўсёды прыцягвала тое, што гэта творы рознай вартасці — ёсць звычайныя, а ёсць тыя, якім месца ў Зброевай палаце. Дарэчы, у свой час там працавала шмат беларусаў, якія пакінулі выдатныя іканастасы, кераміку, жывапіс. Напэўна, добра, што гэтыя майстры працавалі менавіта там — іх спадчына хаця б захавалася. Па тым, што засталося ў нашай краіне, мы не можам мець дастатковага ўяўлення пра старажытнае беларускае мастацтва, затое мы ведаем дакладна: гэта было штосьці вялікае, тут было наладжаны вытворчасць і школа, кіпела жыццё. У рускім старажытным мастацтве ёсць нейкая засушанасць, бачна, што школа пераважала над асобай мастака. А ў беларускіх творах присутнічае свабода, аўтары не трымаліся аўтаматыкі і канонаў, дазвалялі сабе вольнасці. Нават рэчы невысокага прафесійнага ўзроўню прыцягваюць сваёй непасрэднасцю. Да таго ж мне здаецца, мастакі адразу бачылі вобраз таго, што хацелі напісаць, таму асабліва не задумваліся, не шукалі на дошцы натхнення, як сучасныя аўтары перапісваюць па сто разоў. Крыва і коса — не важна, як атрымліваецца, мастака гэта задавальняе, таму што ён выказваецца па сваім жаданні.


«Нядрэмнае вока» XVIII стагоддзя з фонду Нацыянальнага мастацкага музея.

***— Ці існуе паняцце «беларуская рэстаўрацыйная школа»?***

— Паняцце няма, а школа ёсць. Паняцце сфарміруецца, калі яго агучаць і прааналізуюць мастацтвазнаўцы, напішуць пра яго ў кнігах. У нас ніхто свядома не займаецца фарміраваннем школы, але яна існуе. Калі пасля вучобы ў Маскве мы пачалі працу з беларускім мастацтвам, зразумелі, што расійскае стаўленне да рэстаўрацыі нам не падыходзіць, бо ў нас іншая тэхналагічная аснова жывапісу. Сапраўдныя майстры з Расіі, што працавалі ў нас, рабілі нашы творы, як свае, не ўлічвалі існаванне змешанай тэхнікі, не ўнікалі, не аналізавалі твор, як гэта робім мы. Фарміраванню ўласнай школы спрыяе таксама разнастайнасць тэхналогій нашага жывапісу, што патрабуе вялікіх навыкаў. Майстры з Яраслаўля і Мінска адзін і той жа твор апрацоўваюць па-рознаму. На стажыроўцы ва Уладзіміры мы выбралі для рэстаўрацыі дзве іконы. Адна аказалася рускай — мы зразумелі гэта па моцным, як слановая косць, жывапісе, а на другой падчас працы ўсё «паплыло» — відавочна заходняе ўздзеянне. У гэтым, дарэчы, і цікавасць, якая дазваляе мне столькі гадоў працаваць — увесь час ты быццам ходзіш па мінным полі. У жывапісе Яраслаўля ўсё проста, хоць застрэлься ад скукі, а ў нас у тэхналагічных падыходах усё рознае.

***— У рэстаўратара ёсць асаблівы позірк, якім ён ацэньвае палотны ў музеях?***

**Сёння ў цэрквы і касцёлы прыходзяць людзі з сумніўным узроўнем прафесіяналізму і прапануюць «падмаляваць» іконы. Такім чынам мы шмат страцілі і яшчэ будзем страчваць.**

— Калі людзі кажуць, што падышлі да карціны і адкрылі для сябе нешта надзвычайнае, я ім зайздрошчу, але больш — не веру. У музеях успрымаць мастацтва перашкаджае натоўп людзей. Мы глядзім жывапіс у кнігах, інтэрнэце, у савецкія часы — на чорна-белых карцінках. Я стаўлюся да гэтага без асаблівага трапятання, толькі аднойчы я спецыяльна ездзіў у Маскву, каб убачыць карціну Ван Гога. А мастацтва ж неабсяжнае. Калі б я жыў у Піцеры, як Бродскі, хадзіў бы ў Эрмітаж і стаяў па два дні ля адной карціны. Бывае, я працую ў музейных залах — нікога няма, чутно нават, як палотны трашчаць. Вось тады ў гэтай адзіноце пойдзеш нешта пагледзець — можа, нешта і ўспрымеш.

***— Здаецца, вы працуеце рэстаўратарам больш з-за азарту першаадкрывальніка, без уздыханняў па мастацтве?***

— Я разумею мастацтва. Я шчаслівы і жыву сваёй працай. Мая задача — зрабіць так, каб творы жылі — ад гэтага я атрымліваю асалоду, магу сесці і ўбачыць відавочны вынік сваіх намаганняў. Я гляджу на твор, над якім працую, як на аб'ект хірургічнай аперацыі, часам трэба тэрмінова прымаць рашэнне, ніякіх сантыментаў.

***— Ваша вока рэстаўратара хутчэй ляжа на Айвазоўскага (таму што гэта Айвазоўскі) ці на ікону невядомага майстра?***

— Дзякуй богу, што я займаюся старажытным мастацтвам. Мне падабаецца, што гэтыя работы безыменныя, што іх аўтары невядомыя — іх быццам няма. Калі б мне давялося працаваць над Левітанам... Вось я бачу яго вобраз, ведаю яго жыццё і творчасць і лезу сваімі грэблямі да яго твора, парушаю яго прастору. Мне прыемней працаваць з таварышамі, якія зніклі. Да таго ж яны прыносяць больш нечаканасцяў, і старажытнае мастацтва мае большую патрэбу ў маёй дапамозе.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Наш Кодэкс

## КАНСТЫТУЦЫЯ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

**Юрый ІГРУША, генеральны прадзюсар кампаніі «БелФільм Група»:**



— Упершыню распрацаваны Кодэкс аб культуры «не мае аналагаў на постсавецкай прасторы» — па сутнасці, ён становіцца Канстытуцыяй для сферы культуры.

Агульны дакумент з агульнымі паняццямі, якія ўжо замацаваны ў цэлым шэрагу дакументаў, — Кодэкс грунтуецца на дзеючых нормах законаў аб бібліятэчнай справе, народным мастацтве і народных промыслах, творчых саюзах і творчых работніках, кінематаграфіі і гэтак далей. Стварэнне адзінага механізму рэгулявання адносін і знішчэнне наяўных недахопаў скарачае і ўпарадкоўвае прававыя акты па пытаннях культуры.

Тут сфармуляваны асноўныя палажэнні і паняцці, але «агульныя месцы» складана ацэньваць і аналізаваць: невядома, якой аддачы чакаць ад гэтага нававядзення, бо цяпер важна, як гэтыя механізмы будуць працаваць.

Упершыню, напрыклад, спонсары і мецэнаты культуры заканадаўча замацаваны як асобныя суб'екты культурнай дзейнасці. Але ці павялічыцца іх колькасць, якія механізмы на практыцы дазволяць пашырыць гэтае кола?

У раздзеле, прысвечаным кінематаграфіі, акрамя традыцыйных агучана і сфармулявана паняцце «прадзюсар», прапісана яго роля ў кінавытворчасці. Раней гэтае слова ў дакументах стараліся акуратна абысці. Час пакажа, якую падтрымку атрымае інстытут прадзюсавання (і не толькі дзяржаўнага), бо для гэтай дзейнасці беларускаму кінематографу неабходныя перамены ў многіх сферах — ад вышэйшай адукацыі (якая падрыхтуе адсутныя сёння сучасных прадзюсараў) да змены ў падыходзе да кінавытворчасці, разумення, што гэта бізнес.

Ці з'явіцца актуальная стратэгічная праграма з пэўнымі мэтамі, прынцыпамі і прыярытэтамі ў сферы кіно? Я практык, і не ўбачыў у Кодэксе нічога істотна новага для сваёй працы. Мэтай гэтага дакумента наўрад ці было ўнесці вялікія змены ў кінавытворчасць, хутчэй — канстатаваць існуючыя правілы.

У разуменні дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да гэтай сферы мы, безумоўна, рухаемся наперад, але эфектыўнасць развіцця самой культуры залежыць ад многіх складнікаў і нюансаў, удасканальваць і дэталізаваць якія яшчэ давядзецца ■

# ГАЛІНА МАКАРАВА.

## ЯНА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ ВЫКОНВАЛА АДНУ РОЛЮ — МЯНЯЛІСЯ ТОЛЬКІ ПРАПАНАВАНЫЯ РЭЖЫСЁРАМІ АБСТАВІНЫ

**Артур Шапенгаўэр, вядомы філосаф, ірацыяналіст і мізантроп, казаў: «Большасць людзей замест таго, каб імкнуцца да дабра, прагнуць шчасця, бляску і даўгавечнасці; яны падобныя да тых дурных акцёраў, якія хочуць заўсёды іграць вялікія, бліскучыя і высакародныя ролі, не разумеючы, што важна не тое, што і колькі іграць, а як іграць». Ён меў рацыю, гэты немец. І калі б жыў Шапенгаўэр гадоў гэтак на 120 пазней свайго часу і калі б ён пазнаёміўся з сапраўдным цудам — з творчасцю беларускай актрысы Галіны Макаравай, то, без сумнення, сапраўды ўсклікнуў бы: «Вось як трэба іграць!»...**



Галіна Макарава. Народная артыстка Савецкага Саюза, народная артыстка БССР, вядучая актрыса Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы. Больш за 60 роляў у кіно... Ва ўяўленні, напэўна, усіх — і аматараў тэатра, і кінагледачоў — яна была настолькі сваёй, дамашняй, роднай, што прадставіць нейкія таямніцы асабістага жыцця ці драматычныя павароты ў яе лёсе, на першы погляд, немагчыма.

Яна была народнай не толькі па званні, але і па сутнасці — настолькі арганічнымі, натуральнымі, роднымі паўставалі героіні ў яе выкананні на сцэне і на экране. Макарава мела славу «ўсесаюзнай бабулі». І гэты вобраз замацаваўся за ёй не толькі з-за шматлікіх «узроставых» роляў: такія цёплыя, мудрыя, строгія і далікатныя, шчодрыя і прамалінейныя жанчыны, якіх іграла Макарава, ва ўсіх у нас жылі дзесьці побач, а таму былі блізкія гледачу. Здавалася, што яна і не актрыса зусім — такімі дакладнымі былі кожны жэст, кожнае слова, інтанацыя... І ў вачах чытаўся такі лёс, іграць які немагчыма — толькі перажыць.

### АГАТА-ГАЛІНА

Наогул бацькі назвалі яе Агатай, у Мінск з роднага Старобіна ў 16 гадоў яна прыехала менавіта пад гэтым імем. Бацька Агаты — афіцэр царскай арміі Кліменцій Чаховіч — у першую сусветную вайну служыў у стаўцы цара. Ён не прыняў савецкую ўладу, ваяваў у арміі Дзянікіна, дайшоў да Крыма, але не эмігрыраваў, таму што ў Старобіне засталіся жонка і чатыры дачкі. У 1921 годзе Кліментa Уладзіміравіча асудзілі, і 5 гадоў ён правёў у турме. Выпусцілі. Але таўро «пазбаўленца» засталося на ўсё жыццё, і не толькі ў яго — ва ўсіх членаў сям'і: гэта азначала адмову ў праве на працу, паступленне ў інстытут, атрыманне прадуктовых картак.

Жылі вельмі бедна. І ў 16 гадоў Агата падаецца ў Мінск. Уладкоўваецца хатняй прыслужніцай, пазней — санітаркай. Галасістая, музычная дзяўчына ўдзельнічае ў самадзейных пастаноўках і спрабуе паступіць у студыю Першага беларускага драматычнага тэатра (так тады называўся Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). Аднак яе не прымаюць, усё па той жа прычыне: з сям'і «пазбаўленца». У тыя гады за такі радавод (дзед, дарэчы, быў святаром) можна было пазбавіцца не толькі кар'еры, але і жыцця. Невядома, як склаўся б лёс Агаты Чаховіч, калі б на яго не паўплываў бацька яе прыяцелькі (не апошні чалавек у Міністэрстве культуры БССР), які сказаў студыйнаму начальству: «Прамаргаеце такі талент, самі потым пашкадуеце». І з другой спробы ўжо пад прозвішчам маці — Апанашчык — Агата дамагаецца свайго. У студыі змяняе і сваё імя — становіцца Галінай. Паводле легенды, гэтае імя прапанавала ёй сама Ржэцкая. Быццам бы Лідзія Іванаўна сказала ёй: «Што гэта яшчэ за Агата?! Пагледзі, як гэта прыгожа, рамантычна, па-беларуску гучыць — Галінка!»

Але адкуль узялася той рамантыцы ў душы простай старобінскай дзяўчыны?! Яе там ведалі па мянушцы Бубен! Яна была завадной, шумнай, азартнай, захаплялася конным спортам, ганяла на матацыкле, нават стала чэмпіёнкай рэспублікі па мотакросе ў 1937-м. Часта ўспамінала, як аднойчы на матацыкле заехала ў вітрыну крамы. Потым даводзілася эканоміць, недаядаць, каб кампенсаваць нанесеную шкоду. Яна не толькі ліха ганяла на матацыкле, але яшчэ і скакала на кані і нават кідала кап'ё на стадыёне «Харчавік» у парку Горкага (усе яго ведаюць).

Перад самай вайной, у 1939-м, маладая актрыса Галіна Апанашчык пазнаёмілася з афіцэрам Іванам Макаравым. Ён прыйшоў у тэатр, а пасля спектакля зайшоў за кулісы. Прыгажун Макараў быў неверагодна шчадралюбны, спачатку стаў заляцацца да адной актрысы, потым пераключыў сваю ўвагу на Галіну. Раман разгарэўся з такой страсцю, што акторка пакінула тэатр і з'ехала з Макаравым у Кандалакшу — на Кольскі паўвостраў. Там у іх нарадзіўся сын Эдуард. Натуральна, ні пра які тэатр на беразе Белага мора і размовы не ішло, але Галіне, зараз ужо Макаравай, было ўсё роўна.

### «ПРАКІНУЛА ВАХТАНГАЎСКІ»

Калі пачалася вайна, Іван Макараў пайшоў на фронт, а Галіна разам з сынам прыехала спачатку да ягоных бацькоў у Маскву, а затым з'ехала ў эвакуацыю ў Яранск. З эвакуацыі яна вярнулася ў Маскву, стала шукаць працу, паспяхова прайшла гутарку ў Вахтангаўскі тэатры. Але тут вярнуўся з фронту муж з... «ВПЖ» — ваенна-палявой жонкай, як казалі тады. Што рабілася ў душы Галіны, складана ўявіць. Бо Макараў хацеў, каб яна з сынам засталася жыць з яго бацькамі. Але яна ў гэты час выпадкова сустрэла на Цвярской вядомага беларускага скульптара Заіра Азгура, які тады таксама жыў у Маскве, і даведалася ад яго, што купалаўцы вяртаюцца з эвакуацыі ў Мінск. І вырашыла ехаць на радзіму. Тым больш што Макараў кінуў ёй: «Ды каму ты там патрэбна!» Але Галіна была з гонарам: «Гэта я не патрэбная?!» Стала збіраць рэчы. Азгур адгаворваў: цягнік, у якім вярталіся ў Мінск акцёры БДТ-1, трапіў у крушэнне, загінулі людзі, у тым ліку і яго жонка, якая, праўда, да таго часу кінула скульптара і сышла да іншага. І Заір Ісакавіч, увесь у супярэчлівых эмоцыях, шчыра раіў Макаравай не звязваць жыццё з тэатрам, з гэтым «балотам», у якім кіпяць такія д'ябальскія страсці.

Але яна з'ехала.

— Мама сабрала Эдзіка і вярнулася ў Мінск, — распавядае дачка Галіны Кліменцьеўны Таццяна Касцюніна.

*— Макараў ніколі не думаў, што мама можа дамагчыся такога поспеху. Калі яна стала народнай артысткай СССР, часта тэлефанаваў, крыўдзіўся, што мама, калі прыязджае ў Маскву, ніколі яму не тэлефануе. Але яна яго вельмі любіла. З-за яго яна любіла дажджлівае надвор'е. Аднойчы прызналася мне: ёй здавалася, што ў дождж Івушка(так яна называла яго ўсё жыццё) нікуды не пойдзе, а калі сонечна — адправіцца на пошукі любоўных прыгод...*

Сын Эдзік жыў з Галінай Кліменцьеўнай у Мінску. У пачатку 50-х яна разам з новай сям'ёй — мужам акцёрам-купалаўцам Паўлам Пекурам і дачкой Таццянай — атрымала кватэру на Круглай плошчы. Зараз на гэтым доме вісіць мемарыяльная дошка актрысы. Што да другога мужа, Паўла Пекура, то ён калісьці зняўся ў культавым беларускім фільме «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Ён быў выдатным мужам — добрым, вытрыманым, спакойным, пісаў карціны, гатаваў абеды, шчыра радаваўся поспехам жонкі. У іх нарадзілася дачка Таня. Да другога мужа Макарава ставілася з вялікай пяшчотай, павагай. Любіла яго. Ён адзін умеў гасіць яе выбухны характар.

— Эдзіку было 12 гадоў, і мама адправіла яго да бацькі ў Маскву, — успамінае Таццяна Пекур-Касцюніна. З аднаго боку, тата і мама былі ўвесь час у раз'ездах, на гастролях, а хлапчук у такім узросце, што за ім нагляд патрэбны. Але была і яшчэ адна прычына. Макараў тады служыў у органах, і ён маму прыстрашыў, што, калі яна Эдзіка не аддасць, у яе могуць быць непрыемнасці. Мама спалохалася. Але Эдзік жыў у Маскве з бабуляй і дзядулем, а ўсе канікулы праводзіў у нас, у Мінску. Мы вельмі блізкія да гэтага часу. Ён скончыў славутую «Бауманку» (Маскоўскі тэхнічны ўніверсітэт імя М.Э. Баўмана), але пайшоў па партыйнай лініі. Апошняе месца працы — рэферэнт у Гарбачова.

### НА ПЕРШЫЯ РОЛІ ВЫВЕЎ МАКАЁНАК

...Меў рацыю Заір Азгур: страсці кіпелі і ў купалаўскім тэатры. Праўда, гэта былі страсці зусім іншага кшталту... Інтрыгі непазбежныя ў любым акцёрскім калектыве. І калі б не Андрэй Макаёнак, не выключана, што магчымасці праявіць свой талент Галіне Макаравай прыйшлося б чакаць доўгія гады. Макаёнак напісаў спецыяльна для Макаравай п'есу «Лявоніха на арбіце». Да гэтага Макарава іграла або ролі другога плана, або дублiравала купалаўскую прыму Ржэцкую. Калі б не Макаёнак, у «Лявонісе» іграла б іншая актрыса. Але драматург сказаў: не будзе Макаравай — не будзе і п'есы.

**Невядома, як склаўся б лёс Агаты Чаховіч, калі б на яго не паўплываў бацька яе прыяцелькі, які сказаў студыйнаму начальству: «Прамаргаеце такі талент, самі потым пашкадуеце».**

І потым адмыслова для яе напісаў яшчэ нямала драматычных твораў. Рамантычнай гісторыі, як лічаць некаторыя, там не было, хоць аднойчы ў Макаёнка ўсё ж вырвалася: «Адзіная жанчына, з якой я ажаніўся б, гэта — Галіна Кліменцьеўна Макарава. Але я занадта паважаю акцёра Паўла Пекура, каб адбіваць у яго жонку...».

Так што наступныя пастаноўкі тэатра па творах Андрэя Ягоравіча рэдка абыходзіліся без удзелу Галіны Макаравай: яна іграла ў «Святой прастаце», «Таблетцы пад язык», «Трыбунале».

Кінематограф палюбіў Макараву позна. Шырокую вядомасць яна атрымала, выканаўшы ролю бабы Аляксандры ў фільме ленінградскага рэжысёра Сяргея Мікаэляна «Удовы» ў 1976 годзе. Актрысе ўжо было 57 гадоў — узрост, калі многія кінакар'еры заканчваюцца. Мікаэлян, аўтар любімага многімі фільма «Закаханы па ўласным жаданні», доўга не мог знайсці актрыс для свайго фільма «Удовы». Гэта гісторыя пра дзвюх пажылых жанчын, якія, страціўшы ўсіх сваіх блізкіх на вайне, даглядаюць за магілай двух невядомых салдат, якіх утопай ад немцаў пахавалі ў 41-м годзе. Адзінокія жанчыны пастаянна сварацца, але і жыць адна без адной не могуць. Менавіта роля салдацкай удавы ў гэтым фільме стала для Галіны Кліменцьеўны паваротнай, а сама актрыса — вядомай і запатрабаванай на савецкім тэлеэкране. Пасля гэтага фільма яе запрашалі на здымкі пастаянна, да апошніх дзён жыцця.



Бацька Кліменцій Чаховіч — афіцэр імператарскай стаўкі.

# ЯНА БЫЛА АКТРЫСАЮ

Мала хто ведае сёння, што «Удовы» быў забаронены да паказу — такая ў ім была пранізлівая праўда. І толькі пасля таго, як на праглядзе фільма расчуліўся і нават пусціў слязу сам Леанід Ільіч Брэжнеў, фільм выйшаў на экраны. А пасля гэтага ў адным са сваіх дакладаў генеральны сакратар праявіў клопат пра салдацкіх удоў — ім павысілі пенсіі на 5 рублёў.

Пасля выхаду фільма ў пракат Галіна Макарава стала «галоўнай бабуляй краіны». Так яе бабуляй і памятаюць. Потым былі карціны «Белыя росы», «Іван», «Восеньскія сны», «Альпійская балада», «Развітанне славянкі», «Маладая жонка», «Час выбраў нас», «Апошнія ўцёкі», «Не хадзіце, дзеўкі, замуж»...

Яна была вельмі запатрабаванай — работа ў тэатры, здымкі на кінастудыях краіны... Але Галіна Кліменцьеўна заўсёды знаходзіла час для дзяцей, старалася даць ім тое, чаго самой не ставала ў дзяцінстве.

— Мама дапамагала ставіць спектаклі ў школе № 50, дзе я вучылася, — распавядае Таццяна Паўлаўна. — У адной з пастановак яна нават іграла кікімару. Акрамя звычайнай школы я займалася ў музычнай па класе фартэпіяна. Дарэчы, сальфеджыа мне выкладаў кампазітар Яўген Цікоцкі, наш сусед па доме. Ніколі не забуду, як дадому прынеслі шыкоўнае піяніна. Гэты трафейны інструмент з Германіі прывёз бацька актрысы Маргарыты Гладунко, і мама для мяне яго купіла. Ад шчасця, якое перапаўняла мяне, я кінулася на падлогу і каталася па ёй.

У госці часам прыходзілі вядомыя людзі, гулялі ў карты, размаўлялі, жартавалі. У Галіны Макаравай склаліся цёплыя адносіны з другой нашай «вялікай бабуляй» — Стэфаніяй Станютай, актрысай Малога тэатра Галінай Скарабагатавай (з ёй яна здымалася ў фільме «Удовы»), з яшчэ адной «любімай бабуляй» Савецкага Саюза — Любоўю Сакаловай. Але вельмі блізкіх сяброўак у яе не было. Хоць калі ў каго-небудзь з калег здараліся непрыемнасці, яны заўсёды маглі разлічваць на яе падтрымку. Часам яна прыводзіла дадому нават незнаёмых людзей: выслухоўвала, карміла, дапамагала, калі яны ў чымсьці мелі патрэбу. Чужых праблем, як і людзей, для яе не было. Неяк артысты Купалаўскага тэатра вярталіся з выязнога спектакля і па дарозе ўбачылі перавернуты ваенны аўтамабіль. Аказалася, адбылася аварыя. Сур'ёзна пацярпеў афіцэр, у рану трапіла гразь, гэта магло прывесці да заражэння крыві. Як былая санітарка, Галіна Макарава адразу ацаніла ступень небяспекі: калі рану неадкладна не прадэзінфіцыраваць, можа пачацца гангрэна. Аптэчкі ні ў каго з сабой не аказалася. І тады Галіна Макарава стала ротам высмоктваць гразь і выплёўваць яе...

## НАШ ЖАН ГАБЭН

Федэрыка Феліні казаў: «Дабрыня нефотагенічная». Гэта не пра яе. Так, усе ролі, выкананыя ёю ў кіно і ў тэатры, — станоўчыя, ні адной адмоўнай. А сакрэт яе поспеху вельмі просты: Макарава ніколі і нікога не іграла, ні ў каго ніколі не пераўвасаблялася, а жыла на экране ўласным жыццём, так магутна запаўняючы ўсю экранную прастору, як быццам гэта былі эпізоды яе асабістага жыцця, як быццам усё гэта яна перажыла сама... І практычна ўсе яе ролі, у тым ліку і эпізадычныя, былі вельмі яркімі і запаміналіся надоўга.

**Макаёнак напісаў спецыяльна для Макаравай п'есу «Лявоніха на арбіце». Калі б не ён, у «Лявонісе» іграла б іншая актрыса. Але драматург сказаў: не будзе Макаравай — не будзе і п'есы.**

Можна сказаць, Галіна Макарава ўсё жыццё выконвала адну ролю — мяняліся толькі прапанаваныя рэжысёрамі абставіны. Для гэтага трэба быць не толькі вялікай актрысай, але і вялікім чалавекам. Менавіта таму на «Ленфільме» яе празвалі «Жан Габэн у спадніцы», параўноўваючы тым самым не з кім-небудзь, а з галоўным сімвалам французскага кіно.

Яна была не толькі цудоўнай актрысай, але і надзвычайна добрым чалавекам. Дапамагала заўсёды і ўсім. Дапамагала грашыма, а магла прывесці з вуліцы незнаёмага чалавека толькі таму, што яму не было дзе начаваць. Праўда, часы тады былі іншыя, але і ў тыя часы мала хто адважыўся б так зрабіць.


З першым мужам Іванам Макаравым.

Аднойчы ў кватэры Макаравай пачуўся званок. На парозе стаяў мужчына з кветкамі і каробкай цукерак. Бянтэжачыся і чырванеючы, ён стаў прамаўляць словы падзякі. Аказваецца, напярэдадні ён вяртаўся дадому «падпіўшы». Але да хаты не дайшоў, заснуў на лаўцы ля пад'езда Макаравай. Галіна Кліменцьеўна, вяртаючыся з вячэрняга спектакля, убачыла небараку. Не змагла прайсці міма — вынесла яму падушку і коўдру. Ды яшчэ ноччу выглядвала ў акно, каб ніхто яго не пакрыўдзіў. Раніцай ён акуратна склаў на лаўцы пасцельныя рэчы, а потым вярнуўся ў гэты двор з кветкамі. Суседзі адразу зразумелі, пра каго ідзе гаворка, і паказалі кватэру Макаравай.

Яна ўдастоілася звання народнай артысткі БССР, а потым і народнай артысткі СССР. На другое званне ніяк не разлічвала, паколькі была беспартыйнай.

— Памятаю, тата выходзіць з хаты, у руках трымае газету «Известия» і крычыць маці: «Галка, табе прысвоілі званне народнай артысткі СССР», — успамінае дачка.

Славу Галіна Макарава ўспрыняла спакойна. Здавалася, у яе жыцці нічога не змянілася: яна па-ранейшаму хадзіла за прадуктамі ў крамы і на рынак, ездзіла ў грамадскім транспарце і марыла пра новыя ролі.

Народная артыстка была цалкам пазбаўлена адчування ўласнай выключнасці, вызначалася рэдкай сціпласцю, страшэнна не любіла хадзіць па «высокіх» кабінетах і нешта прасіць.

— Толькі двойчы мама пагадзілася на гэта, і тое таму, што я і брат яе вельмі прасілі, — прызнаецца Таццяна Паўлаўна. — Першы раз, калі я выйшла замуж, у мяне ўжо нарадзілася старэйшая дачка. Упяцярых стала цеснавата ў двухпакаёвай кватэры. Тады яна пахадайнічала аб дадатковай жылплошчы, і нам з мужам далі асобную кватэру. А другі раз для Эдуарда мама папрасіла дазвол на набыццё машыны.

— Яна аддавала сябе цалкам тэатру, сям'і, людзям, — працягвае Таццяна Паўлаўна. — Не ўмела любіць сябе. Я часта ёй паўтарала: «Мама, ты вядомы чалавек. Цябе пазнаюць на вуліцы. Трэба больш надаваць увагі знешнасці». Часам яна саступала майму ціску: купляла нейкія дыхтоўныя рэчы. Але было відаць: гэта зусім не тое, што прыносіць ёй сапраўдную радасць.

Калі вельмі стамлялася, любіла адзіноту і цішыню. З задавальненнем вышывала. А яшчэ любіла працаваць на дачы, высаджваць кветкі, глядзець, як яны распускаюцца. Адных півоняў у яе расло некалькі дзясяткаў. У Мінску ў двары свайго дома Галіна Кліменцьеўна пасадзіла клёны, разбіла кветнік. Ставіла летам на балконе раскладушку і начавала там — пільнавала, каб хто не зрэзаў яе цюльпаны. Машыны ў Макаравай не было. Не хапала грошай. І на дачу, за 30 кіламетраў ад Мінска, яна ездзіла на электрычцы. Часта — позна ўвечары, пасля спектакля. З цяжкімі сумкамі, з саджанцамі. Ехала ў ноч, каб прапалоць градкі або паліць кветкі — за імі ж догляд патрэбны.


Чэмпіёнка рэспублікі. 1937.

Калі здымалася ў «Дзяніскіных апавяданнях», пазнаёмілася з адным работнікам цырка, які даглядаў сланоў. У яго яна часам купляла гной і вячэрняй электрычкай везла на дачу. Прама ў электрычцы ў яе гэты гной аднойчы і скралі, калі яна, стомленая, задрамала. «Дорага б я дала, каб убачыць чалавека, які сцягнуў мае сумкі!» — смяялася яна потым.

Двор дома, у якім жыла Макарава, намаганнямі актрысы выглядаў не горш, чым яе дача. Уражанне псавала толькі сметніца, прыбраць якую жыхары дома прасілі гарадскія службы доўга і беспаспяхова. Аднойчы ноччу гэтая памыйніца ўспыхнула. У цьмянай цемры пажарныя не бачылі, як таямніча мігцела — то ўспыхваючы, то знікаючы — чырвоная кропка «беламорыны» на адным з балконаў. Праз шмат гадоў Галіна Кліменцьеўна прызналася, што гэта яна яе падпаліла. Выйшла ноччу, плюхнула газы і падпаліла... Пасля пажару на ранейшае месца сметнік ужо не вярнуўся.

Памерла Галіна Кліменцьеўна раптоўна на сваёй любімай дачы ў дажджлівы вераснёўскі дзень.

Напярэдадні адзначалі дзень нараджэння ўнука Ягора, засядзеліся. А Галіна Кліменцьеўна так рвалася на дачу, што, калі дзеці не змаглі яе адразу адвезці, нават расплакалася. Перад ад'ездам выйшла на балкон і агледзела двор, у якім пасадзіла ледзь не ўсе дрэвы. А погляд у яе быў нейкі адсутны...

На дачы яна пражыла некалькі дзён.

— У той дзень ішоў лівень, я сказала мужу прывезці яе хоць сілай, — успамінае Таццяна Паўлаўна. — Я месца сабе не знаходзіла, а муж закапаўся, паехаў толькі ўвечары. Вартаўнік нам потым расказаў, што раніцай ён да яе прыйшоў, дапамог прапаліць печку, мама часнок перабірала. А ў абед ён убачыў, што дзверы прыадчынены, зайшоў, а яна на канапе адкінуўшыся сядзіць. Побач — папяроса недакураная.

Яна панічна баялася пакутлівай смерці, баялася быць камусьці цяжкім клопатам. Муж Павел пасля інсульту праляжаў паралізаваным сем месяцаў, вось і яна, нагледзеўшыся на гэта, казала, што, калі апынецца ў такім становішчы, — наглытаецца таблетак. Яна вымаліла ў Бога лёгкую смерць.

...За месяц да смерці Галіны Кліменцьеўны нарадзілася яе ўнучка. Назвалі малую Агатай. Творчы пачатак вызначае ўсіх дзяцей, унукаў і праўнукаў Галіны Кліменцьеўны. Працягнуць акцёрскую дынастыю хацела старэйшая дачка Таццяны — Анастасія. У дзяцінстве Макарава часта брала яе ў тэатр і на здымкі. Анастасія здымалася ў эпізодах фільмаў «Дрэвы на асфальце», «Час выбраў нас», «Лепш быць прыгожай і багатай». Пасля школы паступала ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, але правалілася. Было крыўдна, але Галіна Кліменцьеўна, даведаўшыся пра няўдачу, зусім не засмуцілася. Старэйшы сын Галіны Макаравай, Эдуард, жыве ў Маскве. Пайшоўшы на пенсію, Эдуард Макараў арганізаваў невялікую майстэрню па вырабе дачнага інвентару. А яшчэ ён выдатна гатуе. Калі сваякі сустракаюцца ў Маскве ці Мінску, то стол накрывае звычайна Эдуард Іванавіч. У яго трое дзяцей і трое ўнукаў. Адзін з сыноў Эдуарда Макарава, Іван, стаў гукарэжысёрам.

Таццяна Паўлаўна Пекур акрамя заняткаў музыкай са школьных гадоў займалася плаваннем, фігурным катаннем. Сур'ёзных поспехаў дасягнула ў лёгкай атлетыцы — была чэмпіёнкай БССР па лёгкаатлетычным мнагабор'і. Скончыла Мінскі інстытут замежных моў, рэжысёрскія курсы. Доўгія гады працавала на тэлебачанні.

Дзеці, унукі і праўнукі Галіны Кліменцьеўны сёння жывуць у розных гарадах і нават краінах, маюць розныя прафесіі і захапленні. Але ўсе яны з гонарам лічаць сябе макараўскім кланам.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
*slaneuski@zviazda.by*


«Удовы». Галіна Скарабагатава і Галіна Макарава.

■ Новы вопыт

# ВЫЙСЦЕ З БУТЭЛЬКІ

## Рэпартаж з майстэрні, дзе алкаголікам даюць шанц

**На пачатку года ў невялікім гарадку Смалявічы рашыліся на эксперымент. У межах сацыяльнага праекта адкрылі майстэрню, куды запрашаюць працаваць людзей з залежнасцю, якія стараюцца весці цвярозы лад жыцця. Былыя алкаголікі вырабляюць гіпсавыя фігуркі, дзеляцца з калегамі (а ў «штаце» ўсяго пяць чалавек) надзённымі праблемамі і падтрымліваюць адно аднаго ў сваім жаданні не скаціцца на дно (дзе большасць з іх ужо пабывала). І што важна, дапамагаюць не толькі сабе. Частка цацак трапляе ў дзіцячыя бальніцы, дзе паляпшае настрой маленькім пацыентам.**



Пакуль майстэрня можа прыняць толькі пяць чалавек.

### Працаваць і не піць

Жнівеньскім днём у светлай майстэрні шмат наведнікаў. У рабочым пакойчыку гіпсавыя фігуркі мядзведзікаў і катоў разглядаюць дзеці (улетку яны часта прыходзяць да бацькоў на працу), на ганку сядзяць прывязаныя да парэнчаў сабакі — чакаюць сваіх маленькіх гаспадароў.

Усе работнікі прадпрыемства — людзі з залежнасцю на ранняй стадыі рэабілітацыі. **Уладзіслаў КАЎРОЎ, кіраўнік грамадскай арганізацыі «Здаровы выбар»**, расказвае, што ідэю сацыяльнай майстэрні яны падгледзелі ў Амерыцы. Там працуе падобнае прадпрыемства, але куды большае. Яго работнікі займаюцца рэстаўрацыяй мэблі, азеляненнем, прапануюць паслугі хатняга майстра. Плюс на тэрыторыі знаходзіцца рэабілітацыйны цэнтр для залежных.



Фота Надзеі БУЖАН.

Работнікі прызнаюцца: праца з гіпсавымі фігуркамі ўлагоджвае.

Чаму пад апеку вырашылі ўзяць менавіта алкаголікаў, Уладзіслаў тлумачыць проста:

— Наша арганізацыя дапамагае дзецям, якія знаходзяцца ў складаным становішчы. Але калі вяртаеш іх у сям'ю, дзе бацькі п'юць, зноў узнікаюць праблемы. Таму вырашаць сітуацыю трэба па-іншаму — падтрымаць дарослых.

Хтосьці з супрацоўнікаў прыйшоў у майстэрню сам, іншых накіраваў Смалявіцкі райвыканкам. Каб навучыцца вырабляць фігуркі (заліваць гіпс у падрыхтаваныя формы і потым уручную шліфаваць цацкі), наваспечаным спецыялістам хапае пяці дзён. Заробак на прадпрыемстве здзельны, але ў сярэднім атрымліваюць па 400—450 рублёў у месяц. Няблага для райцэнтра.

Працаваць і піць у ціхую па вечарах тут наўрад ці атрымаецца. Складана прыдумаць адгаворку, чаму не прыйшоў на работу, калі астатнія добра ведаюць гэтыя хітрыкі і апраўданні: самі ж некалі былі ў такіх сітуацыях.

### «Тут ёсць падтрымка»

Гіпсавы пыл хутка асядае на абутку. За сталом ля акна сядзіць брунетка Алена і спрытна зачышчае недасканалых пакуль зайцаў і курачак. Расказвае, што за кожную фігурку — свой тарыф. За апрацоўку адной простай цацкі плацяць пяць капеек, заліўку складаней — 70 капеек. За дзень можна паспець падрыхтаваць да продажу каля 200 фігурак.

Алена — адна з першых, хто ўладкаваўся ў майстэрню. Па спецыяльнасці жанчына кухар-кандытар, але кім толькі ні працавала. Апошняе месца — кладаўшчык металапрадукцыі.

— Сышла, таму што цяжка было, у мяне праблемы з нагамі, — адказвае яна, чаму не затрымалася ў кладаўшчыках. — Гэта мужчынская работа. Праца са зваркай, балгаркай, дрэллю. Вы б і сутак там не пацягнулі.

Праблемы на працы праз алкаголь таксама былі. Некалькі разоў жанчыну прасілі пісаць заяву на звальненне па ўласным жаданні.

Тры гады таму Алену пазбавілі бацькоўскіх правоў. Восем месяцаў дзеці правялі ў прытулку.

— Што я рабіла ў гэты час? Кінула мужа і гуляла. Вось і ўсё, — не хавае жанчына. — А потым вырашыла: трэба неяк вяртаць дзяцей. Паехала закадзіравалася. Думала, цяпер дакладна піць не буду. Глупства! Са мной мужчына быў на кадзіроўцы. Адразу пасля ў краму накіраваўся, бутэльку чарніла ўзяў, 0,7, з гарла выпіў, як кампоцік, і пайшоў далей. У людзей па 10 кадзіровак бывае, і нічога не дапамагае. Не хоча чалавек кінуць — яго не прымусіш.

Алена вырашыла, што хоча. З Новага года «завязала». Запісалася ў мясцовую групу самадапамогі, потым прыйшла ў майстэрню. На работу ходзіць з усмешкай. Кажа, тут адчувае сябе спакойна.

— Усе людзі, якія ведаюць, дзе я працую, кажуць: ты змянілася абсалютна, у цябе іншыя паводзіны, манера размовы. Ім гэта падабаецца.

У цвярозасці Алена параўнальна нядаўна. Прызнаецца: бывае цяжка.

— Такая злосць часам накатвае, думаеш: зараз храпну стакан — палягчэе. Ну добра, сёння ты вып'еш, а што зменіцца? Да лепшага — нічога. Тут (у майстэрні. — **Аўт.**) ёсць падтрымка. А праблема з алкаголем вырашальная. Толькі вырашаць яе трэба паступова, а не сядзець і чакаць цуду.

**«Вялікі плюс, калі кіраўнікі разумеюць цябе і ведаюць пра тваю сітуацыю. Калі б я прыйшоў у іншую арганізацыю і сказаў, што ў мяне залежнасць, ніхто не стаў бы там са мной размаўляць».**

Ціхі хударлявы Саша пераехаў у Смалявічы з Ліды. Прыйсці ў майстэрню яму параіў добры знаёмы.

**— Чаму не ўладкаваліся на звычайнае прадпрыемства?**

— Таму што на вялікіх заводах заўсёды ёсць людзі, якія выпіваюць. Гэта бачна і па тварах, і па манеры размовы. Мяне трасе ад іх, — кажа мужчына, які ў завязцы толькі сёмы месяц. — Таму і не хочацца туды ісці працаваць. Баюся страціць раўнавагу.

Алкагольная гісторыя Сашы пачалася гадоў 20 таму. Міліцыя, пратаколы, пагрозы адправіць у ЛПП. Бацькі дапамагалі шукаць сыну выйсце. Пастаянна давалі грошы на кадзіроўкі.

— І ў Данскіх быў, і ў Хадоркіна. Самае доўгае, колькі пратрымаўся цвярозым, — два месяцы. Апошні раз да канца кадзіроўкі заставалася пару тыдняў. Я ў сябе на лецішчы быў, сусед прынёс гарэлку, кажа: давай вып'ем. Я пагадзіўся, хоць ведаў, што небяспечна. Потым пачалі ногі адмаўляць, зрок пагоршыўся. Трэба было ехаць здымаць той код, а я палічыў: гэта ж 300 тысяч! Колькі ж можна было ўзяць алкаголю! Не паехаў. Яшчэ месяцы два пакутаваў. Калі прыйшоў у групу самадапамогі, стала лягчэй.

Вяртацца да былога жыцця Саша не збіраецца: «Я сваю цыстэрну выпіў».

**— І што далей?**

— Працаваць, ствараць сям'ю. Усё ў маіх руках.

### «Кіраўнікі нас разумеюць»

Віталь у майстэрні за галоўнага. Ранкам збірае ўвесь невялічкі калектыў, прапануе падзяліцца пачуццямі. «Не хачу, каб чалавек рабіў цацку з дрэнным настроем».

Услед за Віталём ходзіць яго 10-гадовая дачка. Усе канікулы яна праводзіць разам з бацькам. І ён гэтаму вельмі рады. Бо тры гады таму ўсё было зусім па-іншаму. Мужчына тады лячыўся ад наркатычнай залежнасці, і ў рэабілітацыйным цэнтры яму рэкамендавалі на час сысці з сям'і.

— Цяпер я разумею, што гэтым самым выратаваў іх. Таму што ў такім вар'яцкім стане, як я быў, страшна было знаходзіцца з дзіцем, — кажа Віталь.

Некалі мужчына меў сваю краму аўтазапчастак, потым будаўнічы бізнес. Але праз наркотыкі паступова нічога не засталося. Без працы і грошай Віталь пазалазіў у даўгі. Набраў крэдытаў на 6000 рублёў.

— У мяне сяброў не стала. Я тэлефаную, а яны ўжо ведаюць, што я хачу пазычыць грошай. Падманы, падманы. Да мамы не мог хадзіць, бо пастаянна бачыў яе слёзы, разумеў, што гэта праз мяне... Я не ўяўляў сваё жыццё без машыны. З 14 гадоў за рулём. Але і машыну прадаў, за 300 долараў, нават не таргаваўся. Паглядзеў, што мне гэтага хопіць на пару дзён ужывання, і не задумаўся, што танна аддаў.

Віталь разважае: напэўна, ён па прыродзе чалавек залежны. «Калі есці што-небудзь смачнае, я абавязкова аб'емся. Усе рэчы, якія падабаюцца, — да фанатызму».

Тое, што ўдалося трапіць на працу ў майстэрню, мужчына лічыць вялікай удачай.

— Можа, Бог мяне так любіць, што даў работу, якая дапамагае паправіцца? Мы тут з аднолькавымі праблемамі, прагаворваем іх, разам ездзім на форумы. Так прасцей. А яшчэ вялікі плюс, калі кіраўнікі разумеюць цябе і ведаюць пра тваю сітуацыю. Калі б я прыйшоў у іншую арганізацыю і сказаў, што ў мяне залежнасць, ніхто б не стаў там са мной размаўляць. Тут Улад і Каця (Уладзіслаў Каўроў і яго жонка. — **Аўт.**) перажываюць за нас. Каця прывозіць пастаянна цукеркі, печыва. «Мне наркалагі сказалі, што, калі ўзнікае пачуццё цягі, салодкае трэба есці». Ну ў якой арганізацыі кіраўнік будзе так клапаціцца?

### Фігуркі для дзяцей

На вуліцы пачынаецца моцны дождж, і работнікі майстэрні хуценька грузяць каробкі з гатовымі вырабамі ў машыну. У рамках акцыі «Каробка Смеласці» гіпсавыя цацкі спачатку развозяць па гандлёвых цэнтрах і прадпрыемствах, дзе прапануюць кожнаму ахвяраваць грошы, выбраць фігурку і пакінуць яе ў спецыяльнай скрыні. Потым сабраныя грошы перадаюцца на патрэбы майстэрні, а цацкі — маленькім пацыентам. РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека ў Гомелі, Дзіцячы хірургічны цэнтр, раённыя бальніцы ў Крупках, Жыткавічах, Барысаве — вось няпоўны спіс устаноў, дзе пабывалі вырабы са Смалявіч. Работнікі пра гэта ведаюць і, здаецца, стараюцца яшчэ больш.

**Заробак на прадпрыемстве здзельны, але ў сярэднім атрымліваюць па 400—450 рублёў у месяц. Няблага для райцэнтра.**

